ПАГЛЯДЗЕЦЬ НА СВЕТ ПРАЗ ПРЫЗМУ МАТЭМАТЫКІ

ЧЫРВОНКА

«ВАЛАНЦЁРСТВА ДЛЯ МЯНЕ – ЯК ЛАД ЖЫЦЦЯ»

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 СНЕЖНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 241 (29355)

Тут будзе «кніжчын дом»

Мікалай БАНКЕЦІК і Валерый РАДКЕВІЧ — будаўнікі-муляры будаўнічага ўпраўлення № 201 будтрэста № 35 — працуюць на ўзвядзенні новага школьнага комплексу ў Кастрычніцкім раёне сталіцы. У будынку, сцены якога яны кладуць, размесціцца школьная бібліятэка.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЛІЧБА ДНЯ

50 млн рублёў

прадугледжана выдзеліць з рэспубліканскага бюджэту на закупку 2 мільёнаў доз вакцыны ад каранавіруса ў 2021 годзе. Сёлета на супрацьдзеянне каранавіруснай інфекцыі ўжо накіравана каля 500 мільёнаў рублёў у выглядзе прамых выплат.

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта са 100-гадовым юбілеем і падпісаў указ аб ўзнагароджанні ўстановы ордэнам Працоўнай Славы.**

- «Камунарка» вырабіла ўжо 1 мільён навагодніх падарункаў.
- **Беларусь прапануе афрыканскім краінам супрацоўніцтва ў сферы паслуг, аграпрамысловым комплексе і машынабудаванні.**
- Шматфункцыянальны спартыўны комплекс у Іванаве плануюць увесці ў эксплуатацыю восенню 2021.
- **Нацбанк выпусціць памятныя манеты спартыўнай і гісторыка-культурнай тэматыкі.**
- У Полацку 11—12 снежня падвядуць вынікі Рэспубліканскага адкрытага конкурсу аматарскіх фільмаў імя Юрыя Тарыча «Я здымаю кіно».
- **Фінал конкурсу «100 ідэй для Беларусі» ў Гродзенскай вобласці пройдзе ў анлайн-фармаце.**

Добрая справа

Яны ўсе — нашы

Сёння стартуе рэспубліканская акцыя «Нашы дзеці»

Кожнае дзіця, няважна, дзе яно выхоўваецца — у сям'і або ў нейкай сацыяльнай установе, мае права на навагодні цуд і на ўвагу ад дарослых. Аб гэтым у Беларусі ўпершыню на самым высокім узроўні загаварылі 25 гадоў таму, і з таго часу дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» стала неад'емнай традыцыяй калядна-навагодніх свят. Падарункі і добрыя словы ад чыноўнікаў, прадстаўнікоў прадпрыемстваў і проста нераўнадушных людзей найперш атрымаюць дзеткі, што маюць патрэбу ў асаблівай дапамозе і клопаце, якія трапілі ў бальніцу або з нейкіх прычын засталіся без апекі бацькоў.

Фота БелТА.

За 25 гадоў правядзення акцыі многае што змянілася, абяздоленых малых стала нашмат менш. З 47 інтэрнатных устаноў, якія былі ў 1995-м, сёння засталося толькі 15, а колькасць дзяцей, якія пражываюць там без апекі бацькоў, знізілася амаль у пяць разоў — цяпер іх 1121.

Сёння малыя выхоўваюцца ў дамашніх умовах, у прыёмных сем'ях — калі ў 1995-м у краіне было ўсяго 11 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, цяпер іх 286, і жывуць у іх 1906 дзяцей.

Але кожнаму з іх, як і хворым дзеткам, патрэбны наша ўвага і клопат. Яны ўсе — нашы. І справа тут нават не ў падарунках, а ў адчуванні таго, што іх любяць, што яны патрэбныя. А гэта — толькі было б жаданне — можа падарыць кожны з нас.

Інавацыі

Электратранспарт, карпаратыўнае сеціва і бескантактавая кавярня

Рэзідэнты Гродзенскага тэхнапарка выходзяць на рынак з інавацыйнымі праектамі

Большасць заснавана на інфармацыйных тэхналогіях. Сярод іх ёсць па-сапраўднаму «прарыўныя». Напрыклад, электронны сэрвіс паслуг для ўсіх гарадоў Беларусі. Альбо карпраратыўная сувязь паміж калектывам універсітэта. Ці наогул наспелае пытанне па арганізацыі дастаўкі невялікіх грузаў малагабарытным электратранспартам. СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгодзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

ISSN 1990 - 763X

ВЯЧАСЛАЎ ФРАНЦАВІЧ КЕБІЧ

9 снежня 2020 года на 85 годзе жыцця пакінуў гэты свет былы Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Францавіч Кебіч.

Вячаслаў Кебіч нарадзіўся 10 чэрвеня 1936 года ў вёсцы Канюшаўшчына Валожынскага раёна Мінскай вобласці. У 1958 годзе скончыў Беларускі політэхнічны інстытут, у 1984 годзе — Мінскую вышэйшую партыйную школу.

Працоўную дзейнасць пачаў у 1958 годзе на Мінскім заводзе аўтаматычных ліній інжынерам-тэхнолагам. З 1973 года — галоўны інжынер, дырэктар Мінскага станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава, а з 1978 года — генеральны дырэктар Мінскага вытворчага аб'яднання па выпуску працяжных і адразных станкоў імя С. М. Кірава. З 1980 года знаходзіўся на партыйнай рабоце: другі сакратар Мінскага гаркама партыі, загадчык аддзела цяжкай прамысловасці ЦК КПБ, другі сакратар Мінскага абкама КПБ. Са снежня 1985 года — намеснік старшыні Савета Міністраў БССР, старшыня Дзяржаўнага планавага камітэта БССР. З 1990-га года па 1994 год — старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. З 1994-га да 2001 года — прэзідэнт Беларускага гандлёва-прамысловага саюза. З 2001-га да 2004 года з'яўляўся членам Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве. З 2004 года працаваў старшынёй Беларускага гандлёва-прамысловага саюза, з'яўляўся кандыдатам эканамічных навук, правадзейным членам Міжнароднай інжынернай акадэміі.

Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Знакам Пашаны, трыма медалямі і трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, меў ганаровае званне «Заслужаны машынабудаўнік БССР», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

Светлая памяць аб Вячаславе Францавічы назаўсёды застанецца ў сэрцах тых, хто яго ведаў і з кім ён працаваў.

Р. А. Галоўчанка, Н. І. Качанава, У. П. Андрэйчанка, І. П. Сергеенка, П. У. Калаур, В. У. Шэйман, М. Г. Снапкоў, Ю. В. Назараў, І. В. Петрышэнка, А. А. Сівак, А. М. Субоцін, У. Ю. Арчакоў, У. Р. Гусакоў, І. В. Мядзведзева, І. Д. Наскевіч, А. А. Волкаў, С. С. Лінг, У. В. Ярмошын, Г. В. Навіцкі, С. С. Сідорскі, М. У. Мясніковіч, А. У. Кабякоў, С. М. Румас, У. В. Калтовіч, Р. В. Пархамовіч, І. У. Кубракоў, А. В. Хмель, Д. Л. Піневіч, У. У. Макей, І. У. Луцкі, А. М. Маркевіч, В. А. Дрожжа, В. Г. Хрэнін, І. В. Карпенка, С. Э. Налівайка, У. А. Вашчанка, А. П. Худык, П. А. Пархомчык, К. К. Шульган, І. І. Крупко, С. М. Кавальчук, А. М. Аўраменка, І. А. Касцевіч, Ю. М. Селіверстаў, А. В. Чарвякоў, В. М. Каранкевіч, А. Л. Сліжэўскі, І. С. Тэртэль, Д. А. Пантус, Д. Ф. Матусевіч, А. Г. Шумілін, В. Б. Татарыцкі, А. П. Лапо, К. В. Бурак, Л. П. Гуляка, В. М. Іваноў.

Спачуванне родным і блізкім Вячаслава КЕБІЧА выказаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў смуткуюць у сувязі са смерцю вядомага дзяржаўнага дзеяча, былога Старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў КЕБІЧА Вячаслава Францавіча, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

У цэнтры ўвагі

АБАРАНІЦЬ СПАЖЫВЕЦКІ РЫНАК

Парламентарыі маніторацьсітуацыю з цэнамі ў раёнах

Такая работа вядзецца сумесна з органамі ўлады і Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі. Інфармацыя паступае ў Рэспубліканскі экспертны савет па пытаннях цэн і тарыфаў. Дэпутаты ў сваіх акругах наведваюць гарадскія і сельскія крамы, рынкі, каб выявіць парушэнні дзяржаўнай цэнавай палітыкі.

У Ваўкавыску такі маніторынг правёў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Павел Паканечны. Ён наведаў некалькі крам і параўнаў цэны з папярэднім перыядам. Вынікі заносяцца ў спецыяльную табліцу, дзе бачна, які ў мінулым месяцы быў кошт аналагічных тавараў па краіне.

— У лістападзе я параўнаў у ваўкавыскіх крамах цэны па 40 пазіцыях — ад агародніны, круп і хлеба да мяса і малочных прадуктаў, — паведаміў дэпутат раённай газеце «Наш час». — Тады па шэрагу пазіцый кошт прадуктаў нават знізіўся ў параўнанні з мінулым месяцам. Капуста і мука аказаліся таннейшыя на 14 працэнтаў, бульба — на 21, каўбасныя вырабы — на чатыры працэнты. Аднак па іншых пазіцыях, такіх, як хлеб, тварог, садавіна, цэны істотна ўзраслі. Значна падаражэлі алей, макаронныя вырабы, гарбата.

Нядаўні маніторынг выявіў рост цэн па большасці пазіцый. У гэтым спісе малако і малочныя прадукты — сыры, тварог, смятана. Падаражэлі свежыя агуркі, цукар, маргарын, назіраецца хуткімі тэмпамі рост цэн на чорны чай, сокі з агародніны. Разам з тым значна знізіліся цэны на грэцкія і ячныя крупы, бульбу.

— Часцей усяго рост цэн у гандлёвых аб'ектах абумоўлены аб'ектыўнымі фактарамі. Гэта і павелічэнне затрат пастаўшчыкоў і вытворцаў, змяненне асартыменту ці якасці прадукцыі, інфляцыйныя працэсы. Калі аб'ектыўных прычын для росту цэн і тарыфаў няма, а ёсць факты неабгрунтаванага завышэння, інфармацыя будзе перададзена ў Пастаянную камісію Палаты прадстаўнікоў па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве. Там усе факты негатыўных тэндэнцый збяруць і перададуць на рэагаванне ў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю.

Мэта такога маніторынгу, адзначыў дэпутат, — дабіцца стабілізацыі цэнавай сітуацыі на спажывецкім рынку. Важна не даспусціць росту цэн, асабліва ў перадсвяточныя дні, калі спажывецкая актыўнасць узрастае. Часам гэтым стараюцца скарыстацца нядобрасумленныя гандлёвыя кампаніі і сэрвісы. Між тым, у краіне да канца года дзейнічае пералік сацыяльна значных тавараў з гранічна дапушчальнымі надбаўкамі, якія не павінны перавышацца.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

PARITETBANK

Открытое акционерное общество «Паритетбанк» (Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а) сообщает, что 21 декабря 2020 г.
в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Паритетбанк»
состоится внеочередное Общее собрание акционеров ОАО «Паритетбанк» в заочной форме по адресу: г. Минск, ул. Киселёва, 61а

Повестка дня:
1. Об утверждении Устава ОАО «Паритетбанк» в новой редакции.
2. Об утверждении Положения о Наблюдательном совете ОАО «Паритетбанк».
3. Об определении размера вознаграждений членам Ревизионной комиссии ОАО «Паритетбанк» за исполнение ими своих обязанностей.

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 10 декабря 2020 г.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, будет проводиться при получении бюллетеней при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Получить бюллетень для заочного голосования и информацию (документы) к внеочередному Общему собранию акционеров лица, имеющие право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, могут по месту проведения собрания (нахождения ОАО «Паритетбанк») 14–15 декабря 2020 г. с 09.00 по 16.00 часов.

Заполненные бюллетени для заочного голосования должны быть представлены по месту проведения внеочередного Общего собрания акционеров (нахождения ОАО «Паритетбанк») по адресу: 220002, г. Минск, ул. Киселёва, 61а – не позднее 16 декабря 2020 г.

Телефон для справок: 237 76 79.

Наблюдательный совет ОАО «Паритетбанк».

www.paritetbank.by

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5. УНП 100233809.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 21 декабря 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/С-22509 общей площадью 241,0 кв. м (наименование: здание мастерской (опалубочной цеха № 7) Б 1/К-П); назначение: здание специализированное иного назначения)
Сведения о земельном участке: площадь – 0,7186 га, кадастровый номер – 500000000005004251, право постоянного пользования
Местонахождение: г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 35/3
Начальная цена: 2 601 835,02 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 260 183,00 бел. руб.
Шаг аукциона: 260 183,00 бел. руб.

Продавец имущества: ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН», ул. Железнодорожная, д. 35, 220089, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона и заключается после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **21 декабря 2020 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.12.2020 по 17.12.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 615-11-11.

Ранее извещения о проведении торгов были опубликованы в газете «Звязда» 18.08.2020 и 28.10.2020.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(029) 615-11-11 (ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»).

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Гі Пармялен абраны прэзідэнтам Швейцарыі на 2021 год

Міністр эканомікі Швейцарыі Гі Пармялен, які прадстаўляе ва ўрадзе праваканцерватыўную Швейцарскую народную партыю, абраны прэзідэнтам краіны на 2021 год. Выбары адбыліся на сумесным пасяджэнні дзвюх палат Федэральнага сходу (парламента). Пасаду прэзідэнта ў Швейцарыі па чарзе займаюць члены Федэральнага савета (урада), які складаецца з сямі міністраў. Прэзідэнт у Швейцарыі не з'яўляецца кіраўніком дзяржавы, гэта прэрагатыва Федэральнага савета. Ён з'яўляецца старшынёй на пасяджэннях урада, пры роўнасці галасоў яго меркаванне становіцца вырашальным. Прэзідэнт таксама прымае кіраўнікоў замежных дзяржаў, якія наведваюць з візітамі Швейцарыю.

На Балі пачаўся масавы голад

Масавы голад, які ахапіў усходнія тэрыторыі інданезійскага вострава Балі, пачаў узмацняцца з-за пандэміі каранавіруса. Пра гэта са спасылкай на статыстычныя даныя паведаміў Al-Jazeera. Паводле інфармацыі тэлеканала, з прычыны рэзкага зніжэння турыстычнага патоку ў рэгіён, абумоўленага абмежавальнымі мерамі на фоне COVID-19, і збяднення праблема недаядання стала актуальная таксама і для жыхароў гарадскіх раёнаў. У прыватнасці, асабліва рэзкі рост колькасці галадаючых зафіксаваны ў акрузе Карангасем, дзе мясцовыя жыхары існавалі на сродкі сваякоў, якія працавалі ў сферы паслуг у іншых частках вострава. Як вядома, на турызм прыпадае каля 60 працэнтаў ВУП вострава.

На Паўночным полюсе зафіксавана рэкордна хуткае пацяпленне

Нацыянальнае ўпраўленне акіянаграфіі і атмасферы ЗША зафіксавала рэкордна хуткае пацяпленне на Паўночным полюсе за ўсю гісторыю назіранняў. Са справаздачы Arctic Report Card 2020 вынікае, што сёлета гэтая тэрыторыя награвалася ўдвая хутчэй за астатнія часткі планеты. Крытычная адзнака ўпершыню пабіла рэкорд, які быў устаноўлены ў 2012-м. Навукоўцы лічаць, што ў перыяд з 2040-га па 2060-ты гады ў Арктыцы можа ўвогуле не застацца марскога лёду, а на Алясцы знікне шматгадовая мерзлата. Спецыялісты не прагназуюць паляпшэння сітуацыі і вяртання да аптымальнага тэмпературнага ўзроўню, які апошні раз быў зафіксаваны ў 2006 годзе.

ХТО МАЕ ПАТРЭБУ

На Гомельшчыне прафсаюзы накіравалі больш як 68 тысяч рублёў на абарону медыкаў ад COVID-19. Гэта сродкі, якія выдзелілі толькі за мінулы месяц.

Галіновы прафсаюз рэгіёна аказаў спонсарскую дапамогу тром гарадскім клінічным бальніцам Гомеля — № 2, № 3 і № 4, цэнтральным раённым бальніцам Чачэрска, Рэчыцы, Светлагорска, а таксама Гомельскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі і Гомельскай гарадской аўтабазе ўстаноў аховы здароўя.

Як адзначаецца на інфармацыйным партале Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аховы здароўя, агульная сума падтрымкі ў Гомельскай вобласці склала больш за 21 тысячу рублёў. Грошы выдаткаваны для набыцця сродкаў індывідуальнай аховы, спецадзення, халадзільнікаў для абсталявання пакояў прыёму ежы.

— Матэрыяльную дапамогу ад абкама ў памеры 3,2 тысячы рублёў атрымалі члены прафсаюза. Яшчэ 14 тысяч рублёў пералічаны ў фонд падтрымкі, што створаны пры рэспубліканскім камітэце галіновага прафсаюза, — адзначае прэс-служба арганізацыі.

Акрамя таго, 8,8 тысячы рублёў выдаткавана пярвічнымі прафсаюзнымі арганізацыямі на дадатковае добраахвотнае страхаванне работнікаў, якія аказваюць медыцынскую дапамогу пацыентам з COVID-19. «Пярвічкамі» таксама аказваецца фінансавая падтрымка супрацоўнікаў, якія аказаліся часова непрацаздольныя з прычыны заражэння каранавіруснай інфекцыяй. Так, на аказанне матэрыяльнай дапамогі 242 членам прафсаюза было накіравана звыш 21 тысячы рублёў.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Адкласці да лепшых часоў

Брэсцкі гарвыканкам не забараняе навагоднія карпаратывы, але не рэкамендуе іх праводзіць

У адміністрацыю Брэста паступаюць прапановы спецыяльным распараджэннем гарвыканкама забараніць правядзенне традыцыйных навагодніх карпаратываў сёлета. З такой жа прапановай звярнуўся занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі, паведаміў у сваім тэлеграм-канале старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.

Санітарная служба растлумачыла свой зварот той сітуацыяй, што найбольш выпадкаў заражэння COVID-19 рэгіструецца сярод дарослага працаздольнага насельніцтва, таму любыя абмежавальныя меры выглядаюць дзейснымі. З гэтай прычыны санітарныя ўрачы палічылі мэтазгоднай забарону адпаведных мерапрыемстваў у аб'ектах грамадскага харчавання, аграсядзібах, забаўляльных установах.

Але гарвыканкам вырашыў не прымаць рашэнне аб забароне. Орган выканаўчай улады выступіў з рэкамендацыяй адкласці навагоднія карпаратывы. А ў якасці прыкладу Аляксандр Рагачук прывёў пазіцыю апарату гарвыканкама, які адмовіўся ад традыцыйнага мерапрыемства ў гэтым годзе.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Спажывец

ДА СВЯТ ПАДРЫХТАВАНЫЯ

Буйныя крамы працуюць да 23.00, а асартымент аўтакрам будзе пашыраны

З 1 снежня пачаліся навагоднія і калядныя распродажы асартыменту беларускіх вытворцаў у гандлёвых сетках краіны. Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю пільна сочыць за цэнамі і асартыментам тавараў у гандлёвых аб'ектах краіны.

— На кантролі як міністэрства, так і мясцовых органаў улады знаходзяцца цэны на тавары патэнцыйна павышанага попыту, — расказаў **начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання МАРГ Міхаіл ЖЫГАЛА.** — Гэта свежая гародніна, садавіна, морапрадукты, ікра, кансерваваны зялёны гарошак, каўбасы, вяндліна, віно, шакалад і іншыя кандытарскія вырабы. Міністэрствам праводзяцца штотыднёвыя маніторынгі ўзроўню рознічных цэн на гэтыя групы тавараў. У выпадку завышэння цэн будуць прымацца меры.

Дзеля забеспячэння якаснага абслугоўвання насельніцтва ў перадсвяточныя дні па краіне праводзіцца актыўная работа па падрыхтоўцы аб'ектаў як гандлю, так і грамадскага харчавання, у тым ліку правядзення ёлачных кірмашоў і распродажаў.

Па ўзгадненні з мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі ў гэтыя дні падаўжаецца час работы крам і аб'ектаў грамадскага харчавання. У цэлым ужо падоўжана работа 118 гандлёвых аб'ектаў, 56 аб'ектаў грамадскага харчавання. Плануецца працягнуць час работы яшчэ ў 26 крамах і 31 аб'екце грамадскага харчавання. Буйныя гандлёвыя аб'екты ўжо сёння функцыянуюць да 23:00.

Асаблівая ўвага надаецца абслугоўванню ў святочныя дні сельскага насельніцтва. Адміністраваннем гэтага пытання займаецца Белкаапсаюз, на балансе якога знаходзіцца большасць аўтакрам, што абслугоўваюць сельскія населеныя пункты. Асартымент тавараў у аўтакрамах будзе пашыраны і, вядома, арганізаваны асаблівы кантроль за цэнамі ў гэтых нестацыянарных крамах.

У аб'ектах грамадскага харчавання ўжо з лістапада арганізаваны прыём папярэдніх заказаў ад насельніцтва на выраб мучных, кандытарскіх, булачных і кулінарных вырабаў, у тым ліку ў банкетным афармленні.

У кавярнях і рэстаранах ужо дзейнічаюць святочныя меню. Акрамя таго, арганізаваны прыём заказаў на абслугоўванне навагодніх, калядных «агеньчыкаў», карпаратываў, а таксама святочнае абслугоўванне дзяцей і іншыя мерапрыемствы. Арыенціровачны кошт пераднавагодніх мерапрыемстваў у аб'ектах грамадскага харчавання складае ад 27 рублёў да 160 рублёў на чалавека. У навагоднюю ноч цэннік аб'ектыўна будзе вышэйшы — ад 50 рублёў.

Ва ўсіх рэгіёнах цяпер актыўна праходзіць падрыхтоўка да правядзення кірмашоў. Усяго іх запланавана правесці каля 160.

— Усе мерапрыемствы па падрыхтоўцы да калядных свят будуць ажыццёўлены з улікам рэкамендацый па прафілактыцы каранавіруснай інфекцыі, — запэўніў прадстаўнік МАРГ. — У выпадку змянення эпідэміялагічнай сітуацыі на асобных адміністрацыйных і тэрытарыяльных адзінках магчымыя змены як у колькасці, так і ў фармаце іх правядзення.

З 18 снежня ў сталіцы на пляцоўцы каля Палаца спорту, а таксама на Кастрычніцкай плошчы будзе працаваць традыцыйны «Калядны кірмаш». Там будзе прадстаўлены шырокі асартымент цацак, сувеніраў, навагодніх падарункаў, ёлачных аздабленняў і харчовых тавараў. У навагоднюю ноч кірмаш будзе працаваць да чатырох гадзін раніцы. Такія кірмашы пройдуць ва ўсіх адміністрацыйных раёнах сталіцы, а таксама ў буйных гарадах.

З 14 снежня ў Мінску пачнуць працаваць ёлачныя базары. Кошт дрэва ў залежнасці ад рэгіёна і вышыні будзе стартаваць ад 6 рублёў 20 капеек без уліку ПДВ. Што датычыцца штучных ёлак і хвой, то сёння ў гандлёвых аб'ектах можна купіць больш за сто найменняў гэтых тавараў па кошце ад 4 рублёў 16 капеек і вышэй.

Ва ўсіх рэгіёнах запланавана больш за 9,5 тысячы мерапрыемстваў па стымуляванні спажывецкага попыту. Яшчэ парадуюць навагоднім зніжкавым абслугоўваннем ветэранаў, інвалідаў, людзей пенсійнага ўзросту, шматдзетных сем'яў і людзей, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай дапамозе.

Да пачатку снежня ўжо праведзена 244 выстаўкі-продажы, каля 1,5 тысячы святочных распродажаў, 50 рэкламных акцый і 15 рэкламных гульняў.

Ужо сёння айчыннымі вытворцамі сумесна з прадпрыемствамі гандлю вядзецца актыўная работа па стварэнні запасаў навагодніх падарункаў, кандытарскіх вырабаў, шампанскага, вінаў і іншых тавараў, што карыстаюцца павышаным попытам у перадсвяточныя і святочныя дні.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Каштоўныя паперы

Чэкі «Маёмасць» будуць «жыць» яшчэ як мінімум два гады

Урадам нашай краіны прынята рашэнне аб прадаўжэнні тэрміну абарачэння імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» да 31 снежня 2022 года, паведамляе прэс-служба Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.

Абмяняць імянныя прыватызацыйныя чэкі на дзяржаўныя акцыі магчыма ў падраздзяленнях ААТ «ААБ Беларусбанк», якія выконваюць названыя аперацыі. Там жа можна азнаёміцца са спісам акцыянерных таварыстваў, акцыі якіх прапануюцца да набыцця ў абмен на чэкі, і інфармацыяй аб гэтых таварыствах. Пры звароце неабходна прад'явіць пашпарт грамадзяніна краіны і сертыфікат чэкаў «Маёмасць».

Нагадаем, што ў цяперашні час для абмену на чэкі «Маёмасць» прапануюцца акцыі каля двухсот адкрытых акцыянерных таварыстваў, якія ажыццяўляюць дзейнасць у розных сферах вытворчасці і аказання паслуг.

Пры абмене чэкаў «Маёмасць» на акцыі адкрытых акцыянерных таварыстваў грамадзяне маюць права выкарыстоўваць чэкі, выдадзеныя ім асабіста, а таксама атрыманыя па дагаворах дарэння і (або) па спадчыне ад блізкіх сваякоў (бацькоў, дзяцей, мужа і жонкі, родных братоў і сясцёр, унукаў, бабуль, дзядуль, свекрыві, свёкра, цесця і цешчы), пры ўмове, што дорацца (атрымліваюцца ў спадчыну) толькі чэкі, выдадзеныя блізкім сваякам, але ў суме не больш за 250 імянных прыватызацыйных чэкаў «Маёмасць» на працягу ўсяго перыяду бязвыплатнай прыватызацыі.

Набываючы акцыі, грамадзянін становіцца акцыянерам адпаведнага акцыянернага таварыства і, згодна з заканадаўствам, надзяляецца правам на ўдзел у кіраванні таварыствам, атрыманне інфармацыі аб яго дзейнасці, а таксама правам на продаж, дарэнне і перадачу такіх акцый, якія належаць яму па спадчыне. Спісы прафудзельнікаў маюцца на сайце ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа».

Сяргей КУРКАЧ.

АД ВЫРАБУ МАШЫН ДА КОЛКІ ДРОЎ

Свая справа

Для падтрымкі дзелавой ініцыятывы ў нашай краіне робіцца шмат. Усё больш ахвотных пачаткоўцаў у бізнесе, жадаючых стаць рамеснікам, заняцца фермерствам, упэўніваюцца ў тым, што ўмовы для старту і развіцця самыя добрыя.

У тым ліку аказваецца і фінансавая падтрымка ў рамках дзяржаўнай праграмы «Малое і сярэдняе прадпрымальніцтва ў Рэспубліцы Беларусь» на 2016—2020 гады. У прыватнасці, сёлета ў Прыдзвінні на гэтыя мэты прадугледжана выдаткаваць больш за 1,8 мільёна рублёў.

Тыя, хто мае права атрымаць грошы, вызначаны рашэннем Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў. У вобласці каля 31 тысячы суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. У тым ліку больш за 22,7 тысячы індывідуальных прадпрымальнікаў.

Ад іх летась у бюджэт вобласці пералічана 441,5 мільёна рублёў — а гэта каля 24 % у агульным аб'ёме паступленняў.

Сярод фірмаў, якія функцыянуюць у Віцебскай вобласці, ёсць тыя, што выраблюць унікальную прадукцыю. У прыватнасці, машынабудаўнічая кампанія «Віцебскія пад'ёмнікі». Не так даўно тут распачалі выраб навінкі: самага магутнага пад'ёмніка з тэлескапічнай стралой, вышыня пад'ёму якой да 45 метраў. Сёлета тут асвоілі і выраб унікальнага перавозчыка смецця: ён можа прэсаваць яго, манеўраваць у самых маленькіх дварах, падымаць кантэйнеры любых тыпаў.

Прадпрыемства было створана ў 2004 годзе як сэрвіс па рамонце грузапад'ёмнай тэхнікі. Першы пад'ёмнік быў выпушчаны праз пяць гадоў. Тады вытворчая магутнасць прадпрыемства складала ўсяго 10 аўтамабіляў у месяц. У 2016-м была праведзена буйная мадэрнізацыя завода: пабудаваны новыя вытворчыя цэхі, закуплена найноўшае сучаснае высокатэхналагічнае абсталяванне, якое дазволіла аўтаматызаваць вытворчасць і павялічыць выпуск аўтамабіляў да 40 адзінак у месяц.

У сувязі з тым, што колькасць відаў бізнесу, якія юрыдычна не адносяцца да прадпрымальніцкай дзейнасці, павялічылася з 18 да 30, значна больш стала тых, хто вырашыў зарэгістравацца па заяўным прынцыпе. І колькасць самазанятых пастаянна расце. Што цікава: палова ўсіх, хто працуе па такім прынцыпе, аказваюць цырульныя і касметычныя паслугі. Вельмі распаўсюджаныя таксама распілоўка і колка дроў, тынкавальныя, малярныя і шклярныя работы...

Каб з нуля разабрацца, з чаго распачаць сваю справу, дзейнічае сетка суб'ектаў інфраструктуры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Віцебску, Аршанскім раёне, Наваполацку, Полацку і Глыбокім.

Ёсць і інкубатары для тых, хто распачаў дзейнасць у малым бізнесе. Яны дзейнічаюць у абласным цэнтры, Оршы і Полацку. Там кансультуюць па пытаннях фінансавай адукаванасці, падаткаабкладання, аховы працы, ажыццяўлення экспартнай дзейнасці. А яшчэ аказваюць маркетынгавыя, бухгалтарскія, юрыдычныя паслугі. На плошчах інкубатараў размешчана больш за дзвесце арганізацый, дзе працуе каля 1,3 тысячы чалавек. Інкубатары здаюць у арэнду памяшканні, офіснае абсталяванне. Вельмі важна, што пры гэтым садзейнічаюць у пошуку партнёраў, атрыманні фінансавых рэсурсаў, укараненні ў вытворчасць сучасных тэхналогій. Цяпер інкубатар «Закон і Парадак» рэалізуе праект па стварэнні тэхналагічнага парка біямедыцынскіх і інфармацыйных тэхналогій «Віцебская крэмніевая даліна».

Асаблівая ўвага падтрымцы беспрацоўных. Яны атрымліваюць субсідыі для арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці. Мясцовая ўлада ідзе ім насустрач нават па самых дробных пытаннях. Каля ста субсідый у год — гэта не мяжа для падтрымкі тых, хто вырашыў зарабляць самастойна.

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

Электратранспарт, карпаратыўнае сеціва і бескантактавая кавярня

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Навукова-тэхналагічны парк створаны пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы два гады таму для рэалізацыі інавацыйных праектаў. Зараз ён месціцца ў адноўленым будынку і налічвае 13 рэзідэнтаў, палова з якіх — гэта студэнты і выкладчыкі ГрДУ імя Янкі Купалы. Таму некаторыя праекты скіраваны як на раскрыццё ўнутранага патэнцыялу адукацыйнай установы, так і на дапамогу студэнтам на рынку працы.

Гэтаму ў поўнай ступені адпавядае праект па інфармацыйных тэхналогіях і вядзенні бізнесу. Яго распрацоўкай заняліся два факультэты — эканомікі і кіравання разам з факультэтам гісторыі, камунікацыі і турызму. Кірунак самы запатрабаваны — медыя, інфармацыя, камунікацыя, піяр, рэклама. Як растлумачыў **кіраўнік кампаніі-рэзідэнта, старэйшы выкладчык кафедры журналістыкі Сяргей ЛЯШУК,** ідэя ў тым, каб выкарыстаць усе найноўшыя распрацоўкі па гэтай тэме і стварыць новы, больш дасканалы прадукт у сферы электроннага маркетынгу і рэкламы.

— У нашым выпадку быў створаны інфармацыйны партал і праграма, якія прапануюць спажыўцу інфармацыйны сэрвіс з пералікам абсалютна ўсіх паслуг усіх гарадоў Беларусі, — удакладніў суразмоўнік. — Я з такой мабільнай праграмай, едучы па краіне, магу атрымаць інфармацыю, бонусы, зніжкі ад усіх устаноў у месцы знаходжання. І, адпаведна, магу кіраваць імі з дапамогай QR-кода.

Гэтая праграма будзе карысная і для кампаній, упэўнены Сяргей Ляшук. Многія з іх лічаць, што ўмеюць добра сябе рэкамендаваць у сеціве. А на самай справе гэта атрымліваецца не на належным узроўні. Па ўсім відаць, распрацоўка гродзенцаў дапаможа кампаніям правільна ўзаемадзейнічаць з мэтавай аўдыторыяй, будаваць уласныя стратэгіі на аснове апошніх распрацовак у ІТ.

Не забыліся распрацоўшчыкі і пра сваю альма-матар. З дапамогай тых жа «айцішных» рашэнняў ствараецца карпаратыўна-інфармацыйная сетка для ўніверсітэта. Аказваецца, гэта адзіны такі праект у краіне, дзе будзе наладжана ўзаемадзеянне супрацоўнікаў і студэнтаў праз інфармацыйныя тэхналогіі. Да канца года прадукт будзе запушчаны і пачнецца яго продаж у іншых рэгіёнах. А на чарзе — новая распрацоўка.

— Нядаўна ў нас з'явілася ідэя па стварэнні інавацыйнай кавярні з бескантактавай дастаўкай. Плануецца адкрыць яе на плошчах тэхнапарка. Будзе набыта найноўшае абсталяванне, якое ў Беларусі мала дзе ёсць. І праз праграму спажыўцы змогуць заказаць любімую страву і яе дастаўку. У нас будзе дамова з партнёрамі — установамі харчавання, якія гатуюць якасна і па прымальнай цане. Кавярня будзе таксама працаваць у рэальным рэжыме, — расказаў кіраўнік праекта.

Сапраўды, попыт на дастаўку тавараў пастаянна расце. Удасканаліць гэтую сістэму ўзялася і кампанія-рэзідэнт «Класік Электра». Тут мяркуюць карэнным чынам палепшыць работу па арганізацыі і дастаўцы малагабарытных грузаў з дапамогай новага праграмнага забеспячэння, якое будзе суправаджаць выключна электрамабільны транспарт.

— Наша «фішка» ў тым, што мы вырашылі тры праблемы, якія перашкаджаюць развіццю электрамабільнасці. Гэта — высокі кошт, неабходная інфраструктура і дыяпазон зарадкі. Машына можа ездзіць 500 кіламетраў з дапамогай нашага софта і сістэмы зменных акумулятараў, — растлумачыў **кіраўнік кампаніі Сяргей ЖЫЛЬЦОЎ.** — Электрычны транспарт выдаткоўвае ад двух рублёў на 100 кіламетраў прабегу, не патрабуе такога частага тэхнічнага абслугоўвання, як транспарт на вуглевадародах. Плюс — зніжаюцца шкодныя выкіды. Дастаўка на такім транспарце абыдзецца спажыўцу значна танней.

Паўстае пытанне: дзе ўзяць электратранспарт? Па словах распрацоўшчыкаў, электрамабілі на першым этапе будуць закупляць у замежных вытворцаў. Паступова іх можна будзе адаптаваць да беларускай вытворчасці — ставіць мясцовыя шыны і нават рухавікі. Магчыма, гэта падштурхне і беларускіх аўтавытворцаў на выпуск найбольш «хадавых» электрычных мадэляў. Пакуль кампанія мяркуе мець аднаго транспартнага аператара на горад па дагаворы франшызы.

Сяргей Жыльцоў паведаміў, што кампанію дапусцілі ў экасістэму стартапаў «Сколкава» (Расія) для пошуку інвестыцый. Зараз распрацоўшчыкі вядуць перагаворы з краінамі, дзе электрычны транспарт шырока выкарыстоўваецца, каб прапанаваць свой пілотны праект.

— Напачатку мы плануем выпрабаваць нашу распрацоўку ў Эстоніі, дзе прыцягнем да эксперыменту 30 машын. Гэта своеасаблівая стартавая пляцоўка для выхаду на рынкі ЕС, што нам таксама выгадна з пункту гледжання экспартаарыентаванага бізнесу з выкарыстаннем беларускіх рэсурсаў, — адзначыў кіраўнік праекта.

Гродзенцы ўпэўнены, што іх распрацоўка зацікавіць і беларускіх інвестараў, бо прапануе значна таннейшы сродак дастаўкі. А гэта значыць, дазволіць малому і сярэдняму бізнесу развівацца далей. Напрыклад, для статысячнага горада аптымальна мець 330 электрамабіляў. У ход могуць пайсці не толькі электрамабілі, але і электрасамакаты, электравеласіпеды. Самае галоўнае тут — абсталяваць іх новым праграмным забеспячэннем.

Дарэчы, Беларусь плануе актыўна ісці па шляху развіцця электратранспарту, у сувязі з чым рыхтуецца адпаведны праект праграмы на 2021—2025 гады. Названы дакумент цяпер праходзіць дапрацоўку і павінен быць завершаны да 1 студзеня 2021 года. Аб гэтым ішла размова падчас наведвання Раманам Галоўчанкам холдынга «Белкамунмаш». Прэм'ер-міністр вызначыў гэты кірунак як адзін з ключавых у праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і прапанаваў больш актыўна ўкараняць электратранспарт, выкарыстоўваць яго ў камерцыйных мэтах.

Пэўныя крокі ў электрамабільным кірунку плануе зрабіць і ГрДУ імя Янкі Купалы. Факультэт інавацыйных тэхналогій машынабудавання будзе рыхтаваць інжынераў па абслугоўванні электратранспарту. Сёння такая дысцыпліна вывучаецца ў кантэксце іншых спецыяльнасцяў.

Неабходны каментарый дае **Юрый РАМАНОЎСКІ, прарэктар па навуковай рабоце ГрГУ імя Янкі Купалы:**

— Мы ўдзельнічаем у эксперыментальным праекце па ўкараненні канцэпцыі «Універсітэт 3.0» і скіраваны на ўніверсітэт прадпрымальніцкага тыпу. Каб студэнты маглі з чагосьці пачаць, быў створаны цэнтр трансферу тэхналогій, рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Вучэбна-навукова-вытворчы цэнтр «Тэхналаб», які атрымаў статус тэхнапарка. Цэнтр трансферу тэхналогій — гэта мосцік паміж ВНУ і вытворчасцю, паміж распрацоўкамі і іх укараненнем. А тэхнапарк стварае пэўную інфраструктуру для развіцця інавацыйнага прадпрымальніцтва. Тут размешчана высокатэхналагічнае абсталяванне, якое выдзяляецца ў арэнду рэзідэнтам парка па аказанні паслуг у 3D-мадэляванні, 3D-прататыпіраванні, лазернай рэзцы, інфармацыйных паслуг і ншага.

Фота grodnonews.by.

Зараз вядзецца будаўніцтва другой чаргі парка, якое фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і абласнога інавацыйных фондаў. Тут будуць размешчаны як офісныя, так і вытворчыя памяшканні. А таксама выставачныя павільёны, канферэнц-залы, каворкінг-зоны для бізнес-стустрэч.

У ГрДУ імя Янкі Купалы дзейнічае студыя праектаў стартапаў, дзе студэнту дапамогуць сфарміраваць яго бізнес-ідэю, каб яна была запатрабаваная на рынку. Летась створаны фонд інавацыйнага развіцця для падтрымкі прадпрымальніцтва. Ён фінансуе работы студэнтаў і выкладчыкаў па стварэнні прадукту для яго далейшай камерцыялізацыі. Напрыклад, зараз вядзецца распрацоўка прататыпа алкатэстара — паравымяральніка. Пададзены яшчэ чатыры заяўкі на распрацоўку інавацыйных прадуктаў. Пераможцы атрымаюць грашовыя сродкі.

У парку нават ёсць кампанія, якая займаецца псіхалагічным суправаджэннем па інавацыйных методыках. Студэнтка арганізавала ІП і распрацавала праграму псіхалагічнага кансультавання для тых, хто скіраваны на адкрыццё ўласнай справы, асобасны рост.

Для рэзідэнтаў існуюць пэўныя льготы. Практычна ў два разы зніжана стаўка падатку на прыбытак, арэндная стаўка таксама разлічваецца па зніжаных тарыфах, ільготныя ўмовы існуюць пры карыстанні аргтэхнікай і іншым абсталяваннем.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Экалогія

«ПАДЗАРАДЗІЦЦА» АД СОНЦА

Кампанія А1 завяршыла ўстаноўку сонечных панэляў у сямі адукацыйных установах краіны. Гэта стала своеасаблівай узнагародай за перамогу ў конкурсе «Энергія сонца для «Зялёных школ», якую прынесла ім паспяховая прэзентацыя экалагічных і экасацыяльных праграм, акцый і праектаў.

Удзел у конкурсе бралі навучальныя ўстановы, якія з'яўляюцца ўладальнікамі спецыяльнага дыплома «Зялёнай школы». Кожнаму з сямі фіналістаў кампанія А1 падарыла па камплексе спецыяльнага абсталявання для пераўтварэння сонечнай энергіі ў электрычную, а таксама для наглядней дэманстрацыі вынікаў «работы» сонца школьнікам.

«У 2020 годзе ў нашай кампаніі з'явіўся новы кірунак карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці, звязаны з экалогіяй і аховай навакольнага асяроддзя. І мы рады, што адным з першых праектаў для яго развіцця стала ўстаноўка сонечных панэляў у навучальных установах ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Штодзень вучні могуць назіраць за крыніцай аднаўляльнай энергіі, а таксама даведвацца, адкуль яна ўзнікае і чым можа быць карысная», — адзначыў **кіраўнік аддзела карпаратыўных камунікацый кампаніі А1 Мікалай БРЭДЗЕЛЕЎ.**

Цяпер сонечная панэль з далучаным да яе святлодыёдным ліхтаром ёсць у Рэспубліканскім рэабілітацыйным цэнтры для дзяцей-інвалідаў у Мінску, Кобрынскім раённым цэнтры экалогіі, турызму і краязнаўства, сярэдняй школе № 16 г. Оршы, Уцеўскай сярэдняй школе Добрушскага раёна, гімназіі г. Смаргонь, Барысаўскім цэнтры экалогіі і турызму і сярэдняй школе № 3 г. Асіповічы.

«Выкарыстанне такога абсталявання дазваляе не толькі растлумачыць дзецям, як можна выкарыстоўваць энергію сонца, але і значна знізіць расход электраэнергіі. Святлодыёдны ліхтар у прынцыпе нашмат больш эфектыўны за звычайны: яркасць такая ж самая, але выдаткі электрычнасці меншыя амаль у сем разоў — гэта калі б лямпачку напальвання ў 200 Вт замянілі на святлодыёдную ў 30 Вт. А ў нашым выпадку мы яшчэ і карыстаемся прыроднай энергіяй замест электрычнай. Акрамя таго, яе запасу хапае надоўга: стапрацэнтны зарад акумулятара сонечнай панэлі гарантуе восем гадзін бесперапыннай работы ліхтара. Пры гэтым батарэя разрадзіцца толькі напалову», — паведаміла **кансультант рэгіянальнага дапаможнага рэсурснага цэнтра праекта «Зялёныя школы» для ўстаноў адукацыі Мінскай вобласці Алена ШУБАРА.**

Спецыяльнае рэле панэлі аўтаматычна ўключае святло ў цёмны час сутак і выключае, як толькі віднее. Пры неабходнасці гэта можна рабіць і ў ручным рэжыме.

Конкурс «Энергія сонца для «Зялёных школ» праводзіўся кампаніяй А1 летам 2020 года ў партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Праграмай развіцця ААН у Беларусі. Галоўная мэта гэтага праекта — зрабіць экалагічную інфармацыю больш даступнай для школьнікаў і дарослага насельніцтва ў рэгіёнах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Цікавая прапанова

КАРЫСНЫ АКСЕСУАР ДЛЯ ВАШАГА САБАКІ

Радыёкіруемыя акуляры для жывёл распрацавалі навукоўцы БДУ. Кіраўніком праекта з'яўляецца загадчык лабараторыі оптыкі кандэнсаваных асяроддзяў НДІ прыкладных фізічных праблем БДУ Валерый ЛАПАНІК.

Навацыя арыентавана пераважна на сабак з мэтай кантролю і экстраннага рэагавання на іх агрэсію. Напрыклад, пры нечаканых паводзінах жывёлы акуляры дазваляюць яе дэзарыентаваць. Таксама яны могуць быць выкарыстаны падчас дрэсіроўкі сабакі для бяспекі працэсу.

Пры рабоце над аксесуарам навукоўцы БДУ абапіраліся на вопыт нямецкіх калег, якія прапанавалі выкарыстоўваць у акулярах кіруемыя механічныя шторкі. Беларускія вучоныя зрабілі сваю прадукцыю больш таннай. За аснову радыёкіруемых акуляраў узятыя сонцаахоўныя, у якіх звычайнае шкло заменена на вадкакрышталічныя мадулятары. З дапамогай пульта кіравання гаспадар можа змяняць стан шкла з празрыстага на зацемнены і наадварот. Радыус дзеяння пульта дасягае 400 метраў. Для фіксацыі выкарыстоўваецца падвойнае мацаванне, якое не дазваляе жывёле самастойна зняць акуляры. Акрамя таго, яны абараняюць вочы жывёл ад сонечных прамянёў і пападання іншародных цел. Праведзеныя навукоўцамі вопыты паказалі, што дыскамфорт ад нашэння акуляраў праходзіць у сабакі на працягу месяца.

Распрацоўшчыкі гатовыя пры ўмове запатрабаванасці прадукцыі выконваць індывідуальныя заказы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

10 СНЕЖНЯ 2020 г.
ЧАЦВЕР
№ 22 (15899)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Гурт «INVINO»:

«Найлепшая імправізацыя — добра спланаваная рэпетыцыя»

У гасцях «Чырвонкі. Чырвонай змены» — беларускі музычны гурт, які працуе ў стылі поп-рок з 2005 года. У творчай скарбонцы вакалістаў два альбомы — «У свае 23» і «Акустыка», на падыходзе — доўгачаканы трэці. Калектыў з'яўляецца фіналістам шматлікіх фестываляў і праектаў, прымае ўдзел у мясцовых рок-фестывалях, трыб'ютах гуртоў «Placebo», «Green Day», «Muse». Іх песня «Кахаю» — адзін з галоўных саўндтрэкаў да фільма «Бабруйск—Дакар», а знакаміты твор «Марта» быў прызнаны пераможцам на радыё «Сталіца». Хлопцы не перастаюць штурмаваць сцэны Мінска і іншых гарадоў Беларусі і Расіі, актыўна іграюць на шматлікіх сольных канцэртах. У 2017-м змяніўся колішні склад удзельнікаў — разам з салістам і заснавальнікам калектыву Артурам ШУСТОЎСКІМ сталі працаваць бас-гітарыст і бэк-вакаліст Павел БУРЧЫК, ударнік Андрэй ВЕРАСАЎ і менеджар гурта Аляксандр БЛЮМ. Давайце пазнаёмімся з імі бліжэй.

Мы пачалі сваю гутарку з Артура, які расказаў гісторыю назвы гурта: «INVINO» — гэта ўрывак са знакамітага лацінскага выслоўя «In vino veritas», якое перакладаецца як «Праўда — у віне». Напачатку збіраліся з сябрамі ў гаражы, размаўлялі пад келіх добрага напою і рэпеціравалі. На той момант ідэя такой назвы падалася нам арыгінальнай. Наконт музыкі вызначыліся, што хочам пісаць шчырыя рэчы».

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Нестандартны падыход

Паглядзець на свет праз прызму матэматыкі

Каб разрываць шаблоны, трэба мець фантазію і смеласць

«Захапляюся Матэматыкай. Вяду заняткі для дзяцей і дарослых. Люблю футбол і горы». Менавіта так пазіцыянуе сябе на сваёй старонцы ў «Фэйс-буку» настаўнік матэматыкі, трэнер soft skills, ментар праекта «Падрыхтаваны да дыстанцыйнага навучання», распрацоўшчык і вядучы аўтарскіх курсаў «Мастацтва Доказу», «Мастацтва прэзентацыі», «Крыптаграфія», «Агент 007» Ягор ДАЎГАЛЕВЕЦ. Слова «Матэматыка» ён зусім невыпадкова напісаў з вялікай літары, бо для яго яна — не проста прафесія...

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

У педагогіку — праз ІТ

«Матэматыка — гэта космас, бо, седзячы тут і маючы толькі аловак і ліст паперы, вы можаце растлумачыць, што знаходзіцца на адлегласці ад нас у сотні светлавых гадоў, спрагназаваць чорныя дзіркі, — разважае ён. — Матэматыка — гэта трэцяе вока, шостае пачуццё. Спытайцеся ў людзей, што такое матэматыка, і большасць з іх вам скажуць, што гэта лікі і ўменне лічыць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Свой стыль

«БАРБЕРШОП — ТЭРЫТОРЫЯ МУЖЧЫН, АЛЕ МНЕ ТАМ ПАДАБАЕЦЦА!»

У сучасным свеце ўжо нікога не здзівіць тым, што мужчыны хочуць быць дагледжанымі і брутальнымі адначасова, менавіта таму яны ўсё часцей карыстаюцца паслугамі барбершопаў. Нягледзячы на тое, што барберынг — адна з самых маладых сфер у Беларусі, вакол яе ўжо паспеў скласціся міф пра тое, што гэта найперш тэрыторыя моцнай паловы чалавецтва. Але, нягледзячы на такое меркаванне, прадстаўніцы прыгожага полу, якія не прывыклі здавацца, змаглі «ўкараніцца» ў вышэйназваную сферу, разбурыўшы ўсе магчымыя стэрэатыпы.

Лізавета ЖУКОЎСКАЯ ўжо пяць гадоў працуе ў мінскім барбершопе. У індустрыю прыгажосці ёй дапамаглі прыйсці... танцы. Калі яна з калектывам выступала на конкурсах, часта рабіла прычоскі сваім напарніцам і ў нейкі момант зразумела, што ёй падабаецца такі занятак. З гэтай прычыны Ліза паступіла ў тэхналагічны каледж на спецыяльнасць «мастак-мадэльер» і ў працэсе навучання зразумела, што стрыжкі зацягнулі яе больш, чым макіяж або прычоскі. Пасля заканчэння навучальнай установы наша гераіня прапрацавала майстрам-універсалам каля трох гадоў.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 12 2020 г.

Паглядзець на свет праз прызму матэматыкі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

А яшчэ часта можна пачуць скаргі накшталт, а навошта мы ўвогуле вучылі ў школе тое, што нам ніколі ў жыцці не спатрэбілася? Прызнаюся, што адсутнасць значнасці матэматычных ведаў асабіста мяне вельмі моцна засмучае. І я хачу змяніць сітуацыю, бо тое, што прапануецца ў школах як курс матэматыкі, увогуле не пра матэматыку, як бы абсурдна гэта ні гучала».

Цікава, што сам Ягор да цяперашняга разумення матэматыкі ішоў доўга. Да 8 класа ён навучаўся ў самай звычайнай школе ў спальным раёне сталіцы, а з 8 да 11 — у фізіка-мтэматычным класе цяперашняга ліцэя № 1.

— І там мая ранейшая «пяцёрка» вельмі хутка ператварылася ў «тройку», — смяецца ён. — Механіка-матэматычны факультэт у БДУ я выбіраў, кіруючыся прынцыпам, дзе на экзамене больш матэматыкі — вось такі прагматычны падыход. Ішоў шляхам найменшага супраціўлення, бо ўсе мае думкі на той момант былі захоплены выключна футболам. А матэматыка на экзамене ў нас была і пісьмовая, і вусная. Паспяхова здаў яе і стаў студэнтам. Затым было размеркаванне ў вылічальны цэнтр Мінгарвыканкама. Там была работа не толькі за камп'ютарам, але і выезды да кліентаў. Я зразумеў, што мне падабаецца тлумачыць, ўзаемадзейнічаць з людзьмі. Далей пайшоў у сферу IT, дзе працаваў у «халодных продажах» праграмнага забеспячэння. Атрымаў проста фантастычны, універсальны і вельмі каштоўны вопыт чалавечых стасункаў. Ты праводзіш перамовы, дамаўляешся на сустрэчу, ладзіш прэзентацыю. У мяне гэта вельмі добра атрымлівалася. Праўда, ёсць адзін нюанс: калі ты будзеш шчыры, то прадасі свой прадукт толькі таму, каму ён насамрэч патрэбны, але ж у цябе ёсць пэўны план па продажах. Затым займаўся праграмнай аўтаматызацыяй заводаў у Беларусі, Расіі і Украіне, з'яўляўся кансультантам па сістэмах кіравання вытворчасцю. Шукаў сябе.

«Матэматыка — зусім не пра лічбы. Лічбы — толькі адзін з матэматычных аб'ектаў».

Для мяне нейкія знешнія фактары — заробак, магчымасці кар'ернага росту, прэстыж — ніколі не адыгрывалі галоўную ролю, а важна было, каб я атрымліваў задавальненне ад таго, што раблю. Ужо не памятаю дакладна, як гэта адбылося, але знаёмыя сталі звяртацца з просьбай пазаймацца з іх дзецьмі матэматыкай. І вось на кантрасце з малымі — абсалютна адкрытымі, чыстымі, шчырымі і сапраўднымі — я зразумеў, дзе насамрэч маё месца, дзе мне цікава.

Дарэчы, яшчэ падчас вучобы ва ўніверсітэце я ўладкоўваўся працаваць важатым у дзіцячыя аздараўленчыя летнікі. У мяне і маці — настаўніца, і дзядуля — педагог, і нават бабуля хоць і працавала бухгалтарам, але зноў-такі ў сістэме адукацыі — у дзіцячым доме-інтэрнаце. Яшчэ адным моцным штуршком рэалізоўваць сябе ў педагогіцы для мяне стаў удзел у канферэнцыі «EdCamp Belarus». Памятаю, што на кірмашы ідэй я выйшаў і сказаў: «Вітаю ўсіх, я Ягор. Прыйшоў з IT. Запрашаю паглядзець на матэматыку з іншага боку...»

«Ён стаў паэтам...»

— Для мяне вельмі важна пазбавіць людзей страху неразумення матэматыкі, бо часта даводзіцца чуць ад дзяцей і дарослых: «Я і матэматыка — несумяшчальныя». Адкуль вы гэта ведаеце? Можа, вам проста не пашанцавала ў жыцці з настаўнікам... Многія памылкова лічаць, што калі яны пераробяць школьны курс пад практыка-арыентаваныя задачы, то ўсе праблемы адразу вырашацца. Школьная матэматыка — гэта мой боль, — канстатуе Ягор. — Асабліва хвалюе, як яе ўспрымаюць і як выкладаюць з метадычнага пункту гледжання. Настаўнікі не ставяць задачу па ўзбагачэнні светаўспрымання дзіцяці праз матэматыку. Больш важным лічыцца навучанне канкрэтным навыкам і дзеянням. Напрыклад, рашэнню квадратных ураўненняў — навыку, які быў актуальны 20 гадоў таму для інжынераў, бо пад рукой у іх не было сучасных гаджэтаў. Педагогу трэба стымуляваць развіццё ў вучняў самастойнай думкі, але атрымліваецца інакш. Пачынаецца ўрок матэматыкі, настаўнік падае як данасць: «Сума вуглоў трохвугольніка роўная 180 градусаў». І адразу ж дае задачу на замацаванне: адзін вугал роўны 45 градусаў, другі — 70 градусаў, колькі будзе трэці? Чаму б не дазволіць дзецям самім зрабіць адкрыццё. Папрасіць намаляваць трохвугольнік, а пасля памераць яго вуглы і падлічыць суму. Затым — яшчэ адзін трохвугольнік, памераць яго вуглы. Як ні круці, які трохвугольнік ні малюй, а сума вуглоў заўсёды будзе аднолькавая. Дзеці засвояць гэты факт лепш, калі самі прыйдуць да такой высновы».

Калі вы запытаецеся ў пачатковай школе, навошта патрэбная матэматыка, вам адкажуць: «Для таго, каб лічыць грошы». Я імкнуся паказаць, што матэматыка — гэта не толькі лікі і дзеянні з імі, што галоўны вынік вывучэння дысцыпліны — не толькі атрыманне прыкладных навыкаў, а фарміраванне асаблівага матэматычнага мыслення, якое дазваляе больш ясна і глыбока ўспрымаць свет. Нямецкі матэматык Давід Гільберт аднойчы сказаў пра аднаго са сваіх вучняў так: «Ён стаў паэтам, бо для матэматыкі ў яго не хапіла фантазіі». Насамрэч, трэба мець смеласць і фантазію, каб дапусціць у сваёй галаве нешта зусім рэвалюцыйнае. Матэматыкі бачаць свет па-іншаму, разрываюць шаблоны...

Выдзяляць галоўнае

Сёння ў кожнага пад рукой ёсць камп'ютар ці калькулятар, у аб'ектах гандлю працуюць касавыя апараты, тым не менш у пачатковай школе акцэнт, у першую чаргу, робяць на развіцці навыкаў вуснага лічэння. Але ўменне вусна лічыць — такое ж, як уменне завязваць шнуркі. Гэта проста навык. Вось вы ўмееце лічыць у галаве, а Эйнштэйн не ўмеў, але гэта не перашкодзіла яму стварыць тэорыю адноснасці, заўважу, матэматычную тэорыю, якая дае нам мадэль фізічнай рэальнасці. Ёсць такі раздзел «матэматычная фізіка», калі сродкамі матэматыкі даследуюцца чыста фізічныя з'явы, якія мы не можам даследаваць фізічна, праз эксперымент.

Матэматыка — зусім не пра лічбы. Лічбы — толькі адзін з матэматычных аб'ектаў, хоць і дастаткова важны. Матэматыка — пра абстрактныя рэчы, якія вельмі цяжка спасцігаць, але яна дае абсалютна ўніверсальныя навыкі, якія гуманітарыям, можа быць, дапамагаюць нават больш, чым тэхнарам, таму што апошнія выкарыстоўваюць тэхнічныя аўтаматызаваныя сродкі, а тое, што робяць гуманітарыі, немагчыма аўтаматызаваць.

Чаму людзі з матэматычным мысленнем паспяховыя ў любых сферах? Адзін з матэматычных навыкаў — уменне выдзяляць галоўнае і другаснае, прычым у залежнасці ад кантэксту. Тое, што было галоўным у адным кантэксце, можа стаць другасным у іншым. Гэты навык вельмі патрэбны гуманітарыям. Напрыклад, гісторыку трэба ў сябе ў галаве выбудаваць карціну гістарычнага кантэксту, а гэта схема, дзе ёсць пэўныя ўзаемасувязі. З якога ракурсу вы глядзіце і што хочаце ўбачыць? Стужку часу або вы хочаце завязаць усё на ролі асобы ў гісторыі? Графікі, табліцы, дыяграмы... Матэматыка вучыць прадстаўляць інфармацыю па-рознаму, будаваць матэматычную мадэль. Табліца таксама можа быць матэматычнай мадэллю. І графік — матэматычная мадэль прадстаўлення нейкай інфармацыі. І ўраўненне — матэматычная мадэль нейкай задачы. Людзі з матэматычным мысленнем умеюць бачыць галоўнае, адкідваць усялякае шалупінне і выяўляць заканамернасці.

Спецыяльная мова

Ягор лічыць, што казаць «вучыць матэматыцы» некарэктна. Правільна казаць «вывучаць матэматычную мову». А ўжо яе можна прымяняць у фізіцы, біялогіі, хіміі, адным словам, паўсюдна.

— Калі я хачу апісаць захад сонца над морам, то гутарковая мова мне не вельмі дапаможа, а больш падыдзе мова жывапісу, — разважае ён. — Калісьці людзі сутыкнуліся з задачамі, якія яны не маглі вырашыць ні з дапамогай гутарковай мовы, ні з дапамогай музычнай, ні з дапамогай жывапісу, і таму ім прыйшлося вынайсці іншую спецыяльную мову.

Мы не задумваемся, што штодня сутыкаемся з трохвугольнымі лікамі. Сустракаецца група людзей. Яны паціскаюць адзін аднаму рукі. Колькі ў выніку поціскаў рукі адбудзецца, калі сустрэліся тры чалавекі, пяць ці васямнаццаць? Гэта адна задача. Другая: праводзіце на аркушы паперы прамыя лініі, але стараецеся, каб атрымалася як мага больш пунктаў перасячэння. Трэцяя: бярэце прамавугольнік, які складаецца з пэўнай колькасці клетачак, пачынаеце зафарбоўваць у ім дзве клетачкі і лічыце колькасць магчымых варыянтаў. Абсалютна рознае апісанне, але матэматычная мадэль адна і тая ж. Усе рашэнні будуць даваць трохвугольныя лікі. Усё гэта пра адно і тое ж, матэматычная сутнасць адна і тая ж, хоць кантэкст — розны. Пранікнівасць — вось што яшчэ дае матэматыка. І вы хочаце сказаць, што яна патрэбная толькі інжынеру?

Піфагора, дарэчы, лічаць першым філосафам, які вывучаў лікі і тлумачыў з іх дапамогай свет. Ён казаў, што лікі правяць светам. Калі спасцігнеце лікі, то спасцігнеце ўсю светабудову. Матэматыка стаіць за ўсім, нават калі мы гэта не ўсведамляем. Гэта сістэма, якая мае ўласную логіку. Тэарэма — вось што па-сапраўднаму вечнае. Піфагора ўжо даўно няма, але тэарэма Піфагора працуе і будзе працаваць, калі нас з вамі не будзе.

Геаметрыю Ягор параўнаў з казкай, якая тлумачыць проста неверагодныя рэчы. А вось школьную трыганаметрыю нават ён прыгадвае з жахам. «Тое, як яна выкладаецца, гэта нават не апошні цвік у труну, а быццам бы трыганаметрыю пахавалі і зверху насыпалі вялікі курган. Між іншым, трыганаметрыя — адзін з самых прыкладных раздзелаў матэматыкі, адзін з самых цікавых і зразумелых. Раздзел, які займаецца вывучэннем трохвугольнікаў, але школьнікам трыганаметрыя падносіцца зусім у іншым ракурсе», — канстатуе педагог.

Для папулярызацыі матэматыкі Ягор Даўгалевец стварыў адукацыйны праект «Па той бок лікаў» (#ПотуСторонуЧисел), ладзіць варкшопы, вэбінары, майстар-класы, квэсты і гульні. «Па той бок лікаў» — гэта перш за ўсё іншы погляд на матэматыку — як на займальную актыўнасць, якая акрамя авалодання каштоўнымі прыкладнымі навыкамі дае яшчэ і больш глыбокае разуменне свету, у якім мы жывём, — тлумачыць ён. — На групавых занятках вучні даследуюць заканамернасці навакольнага свету, шукаюць адказы на пастаўленыя пытанні і ў выніку робяць свае ўласныя адкрыцці! Я не кажу ім, як і што працуе, а задаю пытанні або прапаную задачы, якія наводзяць на пэўныя думкі. Дзеці прапануюць свае гіпотэзы, якія мы потым разам абмяркоўваем.

У працэсе пошуку адказаў яны вучацца пісьменна разважаць, асвойваюць матэматычную мову, развіваюць абстрактнае і крытычнае мысленне. А вось да ЦТ я не рыхтую — кожнаму сваё. Мне гэта папросту нецікава. Зараз я таксама выкладаю ў прыватнай школе, дзе ў мяне вялікая нагрузка. Прыйшоў да высновы, што толькі працуючы асноўным настаўнікам, можна карэнным чынам паўплываць на разуменне матэматыкі. У планах — стварыць аўтарскі курс матэматыкі для сярэдняй школы».

Мы запыталіся ў суразмоўніка: а калі не позна пачаць ёй займацца? «Я думаю, што калі ёсць рэальнае жаданне, то ніколі не позна, — упэўнена адказаў Ягор. — Канешне, чым старэйшыя мы робімся, тым складаней нам навучацца чамусьці новаму, бо гнуткасць розуму становіцца слабейшай. Упэўнены, што кожны можа знайсці свой шлях да матэматыкі і столькі часу і месца ў сваёй душы для гэтай навукі, колькі палічыць неабходным».

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Справы маладых

ЛЯЧЭБНЫ СОН НА «МЯДОВАЙ ЗАІМЦЫ»

Як навучэнцы і выкладчыкі каледжа стварылі райскі куток на малой радзіме

Яшчэ нядаўна ўчастак зямлі каля вёскі Вусава Капыльскага раёна быў закінуты, зарослы хмызняком. Тут калісьці стаяла сядзіба знакамітага роду Рэйтанаў. У 1840 годзе сюды перасяліўся Станіслаў Рэйтан са сваёй жонкай Саламеяй, які ўзвёў капліцу. Яна захавалася да нашага часу. А вось іншыя пабудовы разбурыліся. Дарэчы, няма і здымкаў, якія маглі б даць сучаснікам уяўленне аб сядзібе.

Фота з сайта каледжа.

Але работнікі і навучэнцы Капыльскага дзяржаўнага каледжа надалі другое жыццё гэтаму куточку малой радзімы. Нямала сіл і намаганняў давялося ім укласці, каб ачысціць і акультурыць тэрыторыю, дзе кожны сантыметр зямлі дыхае гісторыяй.

Усё пачыналася з даследчых работ педагогаў і вучняў установы адукацыі. На раённы конкурс былі прадстаўлены два праекты: «Турыстычны маршрут Капыльскага раёна» і «Поспех на крылах пчалы». У выніку нарадзілася ідэя стварыць «Мядовую заімку», месца, дзе можна было б паралельна рэалізаваць гэтыя два кірункі.

— У праекта некалькі мэт. Па-першае — працаўладкаваць і забяспечыць работай дзяцей з сацыяльна ўразлівай групы. Сярод нашых выхаванцаў шмат сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, — расказвае **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце каледжа Наталля КУДЗЕЛКА.** — Удзел у рэалізацыі праекта — гэта добрая нагода для навучэнцаў атрымаць працоўныя, прадпрымальніцкія навыкі, эканамічныя і экалагічныя веды. Акрамя таго, дзецям прывіваюць любоў да Радзімы, эстэтычны густ, беражлівыя адносіны да прыроды, усяго жывога. Навучэнцы працуюць поплеч з педагогамі, майстрамі вытворчага навучання. Усё, што тут з'явілася, зроблена, пабудавана, уладкавана — справа іх рук.

У прыватнасці, гонар сядзібы — пасека з 26 вулляў. У 11 з іх засялілі пчол, на чарзе астатнія. На тэрыторыі заімкі ўладкаваны спецыяльны домік для апі-тэрапіі «Лекавы сон на вуллях». Хутка з'явіцца яшчэ адзін. А прадукты пчалярства, мёд каледж прадае. Для гэтага набылі ліцэнзію. Нядаўна на тэрыторыі «Мядовай заімкі» ўстанавілі вялікую бочку, якая адначасова можа змясціць шэсць чалавек. Гэтая лазня-парыльня прызначана для лячэння фітатэрапіяй, дзе будуць выкарыстоўваць травы, вырашчаныя на ўчастку. Зрэшты, як і для ферментавання чаю. Першую партыю яго ўжо выпусцілі. Больш за тое, для гатовай сыравіны распрацавалі і пашылі ўпакоўку. Яна ўяўляе сабой мяшэчак з беларускім арнаментам. Акрамя таго, тут можна прагуляцца па вялікай экалагічнай сцежцы з некранутай прыродай, дзе водзяцца дзікія качкі, бабры, лебедзі. Для апошніх змайстравалі домік на воднай паверхні возера. Ёсць і малая экалагічная сцежка, абапал якой высяваюць лекавыя травы.

Пабываць на «Мядовай заімцы» і не наведаць кантактны мінізаапарк — проста немагчыма. Тут жывуць в'етнамскія свінні, дэкаратыўныя куры, фазаны, цацаркі, індыкі розных парод. А ў вальеры разам з камерунскімі козамі пасяліўся кот, які прыблукаў з суседняй вёскі. Жывёлы ставяцца адна да адной даволі паблажліва. Вельмі шмат на заімцы вінаградных слімакоў. Відаць, калісьці іх разводзілі Рэйтаны. Ёсць чым заняцца і самым маленькім — для іх дзіцячая пляцоўка з рознымі атракцыёнамі. А хтосьці з наведвальнікаў можа пагуляць у садзе, дзе налічваецца 230 яблынь.

Практычна ўсе пабудовы на заімцы ўзведзены з падручнага матэрыялу.

— Як вядома, у населеных пунктах з кожным годам змяншаецца колькасць жыхароў, застаецца шмат пустуючых і старых дамоў, — кажа **старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Ірына КІСЛЯК.** — Каледж дапамагае нам іх зносіць, а прыдатныя цэглу, драўніну выкарыстоўвае для асабістых мэт.

— У адной з вёсак разабралі былы Дом культуры, які пуставаў і прыходзіў у непрыгоднасць. Астаткі завезлі на заімку, зрабілі альтанку на 35 чалавек, дзе можна праводзіць розныя мерапрыемствы. Тут уладкавалі месца са спецыяльнай канструкцыяй, якую прыдумалі самі, дзе можна прыгатаваць шашлыкі, барбекю. А ў возеры можна злавіць рыбу, тут водзіцца і шчупак, і лешч, і прыгатаваць юшку. З разабраных пабудоў зрабілі таксама хлеў для жывёлы, будынак, дзе размесціцца музей. У апошнім будуць прадстаўлены экспазіцыі па пчалярстве, народнай творчасці і родзе Рэйтана, — канстатуе **дырэктар каледжа Анатоль ПЯТКЕВІЧ.** — Наогул сядзіба — гэта тая пляцоўка, дзе навучэнцы могуць працаваць, адпачываць, рэалізоўваць творчыя задумы. Яна стала культурна-пазнавальным асяроддзем і для мясцовых жыхароў і школьнікаў раёна. Тут праводзіцца шмат масавых культурных, спартыўных мерапрыемстваў. У прыватнасці, «Малыя зімовыя алімпійскія гульні», «Вясенні марафон», «Восеньскія старты». У рамках апошняга свята адбыўся велапрабег, прысвечаны малой радзіме. Навучэнцы прынялі ўдзел у спаборніцтвах па баскетболе, валейболе, дартсе, шашках, шахматах. Прыемным сюрпрызам стаў для першакурснікаў абрад пасвячэння ў навучэнцы каледжа.

У «Мядовай заімцы» ладзяцца таксама шмат экскурсій. Мясцовыя школьнікі, падлеткі могуць далучыцца да гістарычнага мінулага, прасякнуцца духам даўніны, адчуць, што яны належаць да нашчадкаў вялікага роду Рэйтанаў.

Дадам, што праект падтрымліваюць мясцовыя ўлады. У далейшым яго развіцці зацікаўлены і калектыў. У перспектыве ён будзе ўдасканальвацца.

— Новых ідэй, творчых задум, неабходных ведаў у навучэнцаў хапае. З 2013 года ў каледжы працуе бізнес-кампанія «Эргана», дзе моладзь спасцігае эканамічныя і прадпрымальніцкія кампетэнцыі. Кампанія выпускае абліцовачную і пешаходную плітку, бардзюры, металаканструкцыі, швейныя вырабы, займаецца пчалярствам, вырошчваннем цяплічных культур, аказвае гандлёвыя і кансалтынгавыя паслугі, — сказаў напрыканцы Анатоль Пяткевіч. — А ў 2016 годзе ва ўстанове адукацыі пачалі дзейнічаць інтэрнэт-кавярня і маладзёжны цэнтр адпачынку «Сёмае неба».

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

У ліку найпершых

Працоўныя дні ў студатрадзе — як адно імгненне

Па выніках рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр — 2020», што ладзіць БРСМ, найлепшымі ў Мінскай вобласці ў сваёй намінацыі сталі навучэнцы Салігорскага дзяржаўнага каледжа, якія працавалі ў будаўнічым атрадзе «Перамога-75». Дарэчы, першынство байцы атрымалі не першы раз.

Камісар атрада, сямнаццацігадовы Аляксей МАКАРЭЙКА (на здымку), які вучыцца па кваліфікацыі «электрагазазваршчык, слесар-рамонтнік», даведаўся аб студатрадаўскім руху летась ад свайго сябра. Вырашыў, што таксама трэба далучыцца.

— Ахвотных стаць байцом менавіта нашага атрада было шмат, таму арганізавалі адбор, запрасілі толькі тых, хто сябе добра праяўляў у грамадскім жыцці каледжа. Мне адразу прапанавалі стаць камісарам, я без роздуму пагадзіўся, бо па жыцці вельмі актыўны і ініцыятыўны, імкнуся заўсёды спрабаваць нешта новае. Працоўны семестр сёлета доўжыўся два месяцы, мы шчыравалі ў дзіцячым садку № 37. У абавязкі ўваходзіла выкананне падсобных работ: штосьці пафарбаваць, паднесці, устанавіць. Мы былі замацаваны за вопытнымі майстрамі, а таксама іншымі спецыялістамі. Прачыналіся рана, а восьмай гадзіне раніцы ўжо павінны былі пачынаць справу. А ў вольны час звычайна з хлопцамі разам адпачывалі, ладзілі душэўныя вечары.

Аляксей кажа, што тыя задачы, якія перад ім ставіліся, аказаліся не вельмі складаныя.

— Зразумела, падчас працоўных будняў здараліся непрадбачаныя сітуацыі, але спраўляліся з імі з усмешкай на тварах. Спадабалася, што больш дасведчаныя спецыялісты прынялі нас вельмі добра, шчыра кажучы, чакаў, што да нас будуць ставіцца несур'ёзна, як да дзяцей, але яны разумаўлялі з намі як з роўнымі. Пасля заканчэння працоўнага семестра мы і дагэтуль сустракаемся з хлопцамі, прыгадваем агульныя справы. Дарэчы, калі толькі вырашыў пайсці ў студатрад, бацькі і сябры падтрымалі, некаторыя таксама захацелі паспрабаваць свае сілы ў ім. Для мяне такі вопыт — гэта новыя знаёмствы, цікавыя дні і магчымасць зарабіць уласныя грошы. Сёлета ў мяне была апошняя магчымасць далучыцца да студатрадаўскага руху, але калі прапанавалі б зноў, з задавальненнем пагадзіўся б.

Сямнаццацігадовы Захар ВАСЮКОВІЧ вучыцца ў каледжы па кваліфікацыі «электрагазазваршчык». Пазнаёміўся з рухам студатрадаў два гады таму.

— Спачатку пайшоў у экалагічны, а ўжо сёлета — у будаўнічы. Хацелася не сядзець без справы, нешта зарабіць і набыць новых сяброў. Вольнага часу на аб'екце не было: клалі плітку, падносілі інструменты, выносілі смецце, фарбавалі, замешвалі бетон... Спецыялісты нас многаму навучылі, гэта дакладна спатрэбіцца як сёння, так і ў будучыні. Мне пашанцавала, бо месца працы знаходзілася блізка ад дому, таму я нават на абед паспяваў схадзіць. Складана падчас работы не было, здавалася, што тыя дні праляцелі як імгненне. Адным словам, семестр праходзіў весела і плённа. Сябры, дарэчы, не вельмі падтрымлівалі маю ідэю працаваць летам у студатрадзе, казалі, што лепш пайсці пагуляць на вуліцы, а вось бацькі аднесліся станоўча. Ды і сам я не шкадую пра гэта, такі вопыт, безумоўна, карысны. Цяпер толькі з цеплынёй успамінаю аб ім.

Яшчэ адзін баец, **сямнаццацігадовы Ілья БАШЛАКОЎ,** які вучыцца на электрагазазваршчыка і мантажніка тэхналагічнага абсталявання, таксама як і Захар удзельнічаў у студатрадзе два гады.

— Галоўнай матывацыяй для мяне была магчымасць зарабіць уласныя грошы. Хацеў купіць пэўную рэч самастойна, без дапамогі бацькоў. Гэта першая работа, за якую мне заплацілі грошы. Пасля заканчэння працоўнага семестра ўсім выдалі нават большую зарплату, чым чакалі, гэта не магло не радаваць. Бацькі таксама адобрылі, што я атрымаў такі досвед, яны ўпэўнены, што цяпер буду ведаць цану грашам. Спачатку выкананне некаторых задач давалася не вельмі лёгка з-за таго, што патрабавалася хуткасць ва ўсім, а ў мяне не было дагэтуль падобнага вопыту, таму крыху бянтэжыўся, але потым усё ж такі з'явілася ўпэўненасць. Тым больш дапамагалі вопытныя майстры. Усё тое, чаму яны нас навучылі, я запомню і буду выкарыстоўваць у далейшым.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 12 2020 г.

Рух ад сэрца

«Валанцёрства для мяне — як стыль жыцця»

У Мінску падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу БРСМ «Валанцёр года — 2020». Яніна ГАРБАЧЭЎСКАЯ — пераможніца ў намінацыі «Асабісты ўклад» сярод работнікаў прадпрыемстваў, арганізацый, установ, міністэрстваў і ведамстваў. Дваццацісямігадовая дзяўчына — педагог-арганізатар у гомельскай сярэдняй школе № 22. Скончыла Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны па спецыяльнасці «псіхалогія», валанцёрствам займаецца ўжо пяты год. Яна — заснавальніца і кіраўнік валанцёрскага атрада «Млечны шлях», які, дарэчы, два гады таму таксама станавіўся найлепшым у аднайменнай намінацыі таго ж конкурсу Саюза моладзі.



— Перадумовы для валанцёрства былі яшчэ ў дзяцінстве: заўсёды хацелася чымсьці дзяліцца, камусьці дапамагаць. Памятаю, часта аддавала сяброўкам свае лялькі. Ужо ў дарослым узросце пра магчымасць займацца такой справай даведалася ад першага сакратара Гомельскага абласнога камітэта БРСМ Веранікі Гудковай, асабістым прыкладам яна даказала, што гэта важна. Тады на базе школы мы стварылі валанцёрскі атрад «Млечны шлях», у якім прымаюць удзел школьнікі любога ўзросту, а таксама настаўнікі і выпускнікі, што таксама хочуць быць датычныя да дабрачыннасці.

Акцыя, з якой пачаў сваю дзейнасць атрад, — «Цуды на Каляды». Падчас яе разам з вучнямі Яніна наведала Дом дзіцяці: падарылі яго выхаванцам цацкі і паказалі навагодні спектакль.

— Гэта было цудоўна! І цяпер часта наведваем маладых людзей з інваліднасцю: апранаем касцюмы клоўнаў і ладзім інтэрактыўныя імпрэзы. А яшчэ проста размаўляем з імі, бо іншым разам гэтага не хапае. Увогуле мы пастаянна ўзаемадзейнічаем з дамамі дзіцяці, цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Савецкага раёна абласнога цэнтра, дзіцячай абласной клінічнай бальніцай, Улукаўскай дапаможнай школай-інтэрнатам у Гомельскім раёне і іншымі ўстановамі. Удзельнічаем у дабрачынных акцыях, збіраем дзецям падарункі да розных свят. Сёлета на базе школы адкрылі і гурток па навучанні валанцёраў. Асноўныя метады работы ў нашай дзейнасці — гэта казкатэрапія і клоўнатэрапія. Першую ініцыятыву праводзім у асноўным у школах з «цяжкімі» падлеткамі. Такі метад — спосаб перадачы дзіцяці маральных нормаў і правілаў, што закладзены ў казках, паданнях, былінах і прытчах. Казка дапамагае данесці свае перажыванні да іншых і ўсвядоміць уласныя пачуцці праз навакольных. Апошнюю ж ініцыятыву часта выкарыстоўваем у цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, з імі за апошнія некалькі гадоў правялі вельмі шмат цікавых мерапрыемстваў: вечарыны, трэнінгі і іншыя.

Яніна як валанцёр супрацоўнічае са многімі арганізацыямі: Чырвоным Крыжам, Беларускім дзіцячым фондам, ЮНІСЕФ, БРСМ. Дзяўчына імкнецца не пакідаць паза ўвагай ні адну іх ініцыятыву.

— Не магу доўга сядзець без справы, не хочацца ўпускаць цікавыя магчымасці. Нядаўна брала ўдзел у расійска-беларускім форуме «Нашчадкі гістарычнай памяці» — там абмяняліся вопытам па яе захаванні з хлопцамі і дзяўчатамі. Каля нашай школы на Ляшчынскіх могілках ёсць брацкія пахаванні. Мы іх заўсёды даглядаем, прыбіраем. Нашы ўдзельнікі атрада любяць наведваць ветэранаў педагагічнай працы, гэта вопыт пакаленняў. Мы ім расказваем аб інфармацыйных тэхналогіях, яны — пра сваё жыццё, каштоўнасці. Валанцёрым і на спартыўных мерапрыемствах. Напрыклад, у 2018 годзе на Маладзёжным чэмпіянаце свету па шашках, які праходзіў у Гомелі, суправаджалі каманду Кітая. Што датычыцца рэспубліканскага конкурсу БРСМ «Валанцёр года — 2020», у ім удзельнічала ўпершыню. На ўзнагароджанні для нас былі падрыхтаваныя трэнінгі па лідарстве, інтэрактыўныя пляцоўкі з выстаўкамі, было здорава!

Суразмоўніца падзялілася, што ў іх з удзельнікамі атрада ёсць традыцыя: пасля любога мерапрыемства садзіцца за круглы стол і абмяркоўваць, як прайшла сустрэча, якія пачуцці ўзнікаюць і гэтак далей.

— Для нас важна быць на пазітыве. Мне здаецца, калі хочаце стаць валанцёрам, пажадана быць цярплівым, добрым, стрэсаўстойлівым, сюды прыходзяць тыя, хто гатовы ахвяраваць сваім часам, эмоцыямі. Заўважыла, што калі хтосьці далучаецца да такой дзейнасці, становіцца больш смелы, гаваркі, спагадлівы. Валанцёрства дапамагае развіць камунікатыўныя навыкі, арганізатарскія здольнасці, адказнасць. Мы аддаём часцінку сябе іншым, але ўзамен атрымліваем нашмат больш. Дарэчы, у маім асяроддзі многія цікавяцца такой дзейнасцю, з ахвотай далучаюцца да яе. Сябры не раз удзельнічалі ў дабрачынных акцыях, яны таксама, як і я, лічаць, што гэта змяніла іх свядомасць, мысленне. Мне здаецца, валанцёрства са мной назаўсёды, яно — як стыль жыцця.

Дар'я ШЛАПАКОВА.
Фота з асабістага архіва гераіні.

Свой выбар

«Калі ты навуковец, сумна ніколі не бывае»

За 13 гадоў у Інстытуце фізіялогіі НАН Беларусі Маргарыта ДОСІНА абараніла кандыдацкую дысертацыю, стала лаўрэатам конкурсу «100 талентаў НАН Беларусі», дарасла да пасады вучонага сакратара і паступіла ў дактарантуру.
І галоўнае — ні разу не расчаравалася ў тым, што калісьці аддала перавагу не музыцы, а біялогіі.

— У дзяцінстве і юнацтве займалася па класе віяланчэлі і фартэпіяна, марыла аб тым, што прысвячу сябе тэорыі музыкі. Але ў сёмым класе пасля поспеху на алімпіядзе вельмі захапілася біялогіяй. Скончыўшы Магілёўскі абласны ліцэй № 1, паступіла на біяфак БДУ, — распавядае Маргарыта.

У Інстытут фізіялогіі НАН Беларусі яна прыйшла, калі вучылася на пятым курсе БДУ. Лічыць, што ёй вельмі пашанцавала: і з навуковым кіраўніком, акадэмікам НАН Беларусі Уладзімірам Кульчыцкім, і пазней — з абранай тэмай для дысертацыі. Работу над кандыдацкай называе найбольш складаным, напружаным і разам з тым самым цікавым часам.

— Я даследавала, як уплываюць умовы мікрагравітацыі на рост і развіццё клетак — здаровых і пухлінных, — адзначае суразмоўніца. — Для правядзення эксперымента на Зямлі мадэляваліся ўмовы, аналагічныя касмічнаму палёту. Вынікі шмат у чым апынуліся нечаканыя. Пухлінныя клеткі запавольваліся, а здаровыя альбо не мяняліся, альбо паскаралі свой рост і дзяленне. Памятаю, якое шчасце адчула, калі абаранілася і маю работу высока ацанілі.

Нароўні з такімі даследаваннямі Маргарыта займаецца вывучэннем таго, як, не зніжаючы ўздзеяння хіміяпрэпаратаў на пухлінныя клеткі, абараніць ад іх пабочнага, таксічнага ўплыву здаровыя. Аказалася, гэта дасягальна пры спалучэнні хіміяпрэпаратаў з гетэрацыклічнымі злучэннямі. Удзельнічае яна і ў сумеснай рабоце навукоўцаў інстытута з траўматолагамі; высвятляе, як ствалавыя клеткі (у якасці дадатковага фактару, нароўні з традыцыйнай тэрапіяй) могуць паскорыць аднаўленчыя працэсы пасля траўмаў спіннага мозгу.

Малады навуковец ужо пачала рыхтаваць доктарскую, якую прысвеціць аартальным стэнтам, якія дазваляюць захоўваць цэласнасць артэрый.

Асноўная задача — прааналізаваць бяспеку іх прымянення, параўнаць айчынныя ўзоры з замежнымі аналагамі, вывучыць магчымасці таго, як зрабіць новыя тэхналогіі больш эфектыўнымі для медыцынскіх мэт.

— Навука — гэта спосаб жыцця, нельга быць навукоўцам з 9.00 да 18.00, — разважае Маргарыта. — Сапраўдны даследчык пастаянна ў стане пошуку. Безумоўна, бываюць складаныя перыяды, калі шукаеш і не можаш знайсці адказы на пытанні, якія цікавяць. Навука — адна з самых працаёмкіх сфер дзейнасці, і трэба праяўляць упартасць, не апускаць рукі, заставацца аптымістам. Затое калі дамагаешся, хай і невялікіх, вынікаў на сваім шляху, гэта натхняе і прымушае рухацца далей. А ўжо калі твая распрацоўка знаходзіць практычнае прымяненне, напрыклад, у медыцыне, то зведваеш ні з чым не параўнальнае пачуццё. Быць навукоўцам — неверагодна цікава. Ніколі не бывае сумна.

Маргарыта заўсёды ахвотна ўдзельнічае ў канферэнцыях. Асабліва падабаецца выступаць перад практыкуючымі ўрачамі, чуць іх меркаванні, іх бачанне праблем. Жывы дыялог дазваляе карэктаваць кірунак навуковых даследаванняў. У мінулым годзе як лаўрэат конкурсу «100 талентаў НАН Беларусі» Маргарыта наведала Вялікабрытанію, дзе падзялілася з калегамі вынікамі сваіх даследаванняў і атрымала ўдзячныя водгукі. Заадно пазнаёмілася з эксперыментальнай базай англійскіх даследчыкаў, асвоіла замежныя методыкі.

— Маргарыта — чалавек мэтанакіраваны, працавіты і на рэдкасць арганізаваны. Усё, за што яна бярэцца, робіць добра і своечасова. Паспявае займацца навукай, грамадскай работай (яна старшыня Савета маладых навукоўцаў аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі), аддае час сям'і, — кажа акадэмік НАН Беларусі Уладзімір Кульчыцкі.

Сама гераіня перакананая: жанчыны ў навуцы могуць быць не менш паспяховыя, чым мужчыны, асабліва калі ў іх добры «тыл», калі блізкія шануюць і разумеюць іх працу і памкненні. У яе з гэтым таксама ўсё склалася.

Муж Аляксандр далёкі ад таго, чым займаецца Маргарыта, але ва ўсім падтрымлівае яе і разумее, калі той даводзіцца позна вечарам ці ў выхадныя пісаць навуковы артыкул, рыхтавацца да канферэнцыі.

Прафесіі ў Аляксандра і Маргарыты розныя, але погляды на жыццё, каштоўнасці, прыярытэты падобныя. Свой вольны час яны прысвячаюць тэатрам, музеям, падарожжам, лецішчы. Сама Маргарыта цяпер садзіцца за фартэпіяна ўжо рэдка, значна часцей слухае вядомых выканаўцаў. Музыка для яе — крыніца натхнення. У тым ліку і да навуковай творчасці.

Вольга ПАКЛОНСКАЯ,
фота аўтара.

«БАРБЕРШОП — ТЭРЫТОРЫЯ МУЖЧЫН, АЛЕ МНЕ ТАМ ПАДАБАЕЦЦА!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Падчас гэтага перыяду я ўсвядоміла, што з кліентамі мужчынскага полу мне нашмат камфортней і пачала думаць, як зрабіць так, каб працаваць прыходзілася толькі з імі. Тады і даведалася пра такое месца, як барбершоп, аднак уладкавацца ў першы, які спадабаўся, было не так ужо і проста. Давялося сутыкнуцца з палавой няроўнасцю, многія наймальнікі аддавалі перавагу мужчынам у сілу жадання падтрымаць стыль сваёй установы. Аднак адзін барбершоп усё ж даў мне магчымасць быць у прафесіі. Таму што там працуюць толькі дзяўчаты, гэта такая ўласная адметнасць.

Абавязкаў у нашай гераіні шмат. У першую чаргу — усе віды паслуг ад барбера: стрыжка, галенне, догляд за барадой і валасамі, таніраванне сівізны альбо афарбоўванне ў жаданы кліентам колер, кансультацыя, падбор укладачных сродкаў і сродкаў для догляду. Акрамя гэтага, трэба заўсёды сачыць за чысцінёй свайго рабочага месца, інструментаў, наяўнасці той ці іншай касметыкі на пару з адміністратарам.

— Часта людзі не разумеюць, у чым розніца паміж салонам прыгажосці, барбершопам і звычайнай цырульняй, нават нашы кліенты задаюць нам гэтае пытанне. Давайце спачатку вызначым тое, што салон і цырульня — гэта розны статус аднаго і таго ж месца. Яны адрозніваюцца цэнавым і абслуговым сегментамі, прафесіяналізмам майстроў і падыходам да кліента. А барбершоп — гэта мужчынская зала салона, якая выступае цяпер як самастойнае месца са сваёй стылістыкай і сваімі майстрамі. Апошнім часам такіх месцаў адкрываецца вельмі шмат. Кожны імкнецца вылучыцца, зрабіць нешта незвычайнае. Гэтак жа і ў нас. Галоўная наша адметная рыса — дзяўчаты-майстры. Так, можа быць, мы не зможам падтрымаць гутарку на тэму футбольных клубаў, аднак, пагадзіцеся, прыемна, калі да цябе датыкаюцца далікатныя рукі дзяўчыны, усе рухі плаўныя, і вы атрымліваеце не толькі стрыжку ці галенне, але яшчэ і эстэтычнае задавальненне ад усяго працэсу — у нашай прафесіі гэта таксама важна. Вядома ж, без усялякага непрыстойнага падтэксту.

Хоць асноўнымі кліентамі барбершопа і з'яўляюцца мужчыны, Лізавета ведае прыклады, калі можа прыйсці жанчына і папрасіць стрыжку машынкай «пад нуль», але тут ужо рашэнне прымае сам майстар — брацца за такую работу ці не. Гэтак жа бываюць выпадкі, што ў іх установу прыводзяць на стрыжку маленькіх хлопчыкаў, але галоўная ўмова, каб яны былі не малодшыя за пяць гадоў. І работнікі адразу папярэджваюць, што сачыць за тым, каб дзіця паводзіла сябе спакойна, — задача бацькоў.

— Самае складанае ў нашай прафесіі — гэта знайсці падыход да любога кліента, бо кожны наш госць — індывідуальная асоба. Першае, з чаго я пачынаю работу з чалавекам, гэта дыялог на прадмет жаданняў, пераваг, некаторых жыццёвых момантаў, якія дапамогуць мне падабраць варыянт стрыжкі, альбо скампанаваць пажаданні кліента ў нешта суцэльнае, пракансультаваць яго. Ёсць людзі, якія ведаюць, што хочуць бачыць у сябе на галаве, ёсць тыя, хто гатовы да любых змяненняў. Шмат залежыць і ад настрою чалавека: ва ўсіх бываюць цяжкія дні, клопаты, стрэсы, і ў такія моманты з кліентам вельмі цяжка працаваць. Мы займаемся творчасцю ў такой зоне цела чалавека, дзе адчуваем яго эмацыянальны настрой, і заўсёды павінны адпавядаць яму. Нярэдка бываюць выпадкі, калі госці натхнёныя персанажамі з фільмаў або серыялаў, дакладней, стрыжкамі акцёраў або нават ідэяй афарбоўвання, аднак гэта не значыць, што тое, што пасуе Джоні Дэпу, будзе пасаваць і яму. Гэта таксама важна растлумачыць, каб пазбегнуць негатыўных наступстваў.

Калі вы думаеце, што ў барбершопах робяць толькі аднатыпныя класічныя стрыжкі і выраўноўванне барады, спяшаемся вас расчараваць. Фантазія многіх кліентаў сапраўды не ведае межаў.

— У мяне ёсць кліент, які калісьці прыйшоў і сказаў, што хацеў бы зрабіць каляровыя валасы. Яны ў візіцёра былі да плячэй, іх ён збіраў у хвост. Мы тады пафарбавалі пасмы ў адзін колер, але ён наведваўся да мяне яшчэ шмат разоў, і так пакрысе дадаваліся ўсё новыя і новыя колеры. У выніку ў яго амаль не засталося валасоў «роднага» колеру, і затым ён захацеў усё зрабіць аднатонным. А ў канчатковым выніку прыйшоў і сказаў, што гатовы расстацца са сваёй доўгай прычоскай. І зараз у яго дастаткова кароткая стрыжка, аднак мы ўсё роўна фарбуем яе ў розныя колеры. Справа займае нямала часу, але гэта вельмі цікава.

У канцы нашай гутаркі мы задалі Лізавеце пытанне, ці лічыць усё ж яна, што прафесія барбера больш падыходзіць мужчынам, на што атрымалі ад яе вельмі падрабязны адказ:

— На маю думку, гэта проста стэрэатып. У кожнай справе, няхай гэта будзе барбер або любая іншая прафесія, важнае жаданне, імкненне і зацікаўленасць чалавека. Менавіта гэтыя складнікі робяць як мужчыну, так і жанчыну прафесіяналам у абранай сферы. Аднак я пагаджуся, што ёсць моманты, дзе ў мужчын можа быць перавага.

Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка IV курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.
Фота дадзена гераіняй.

Майстар-клас

АТРЫМАЛА ДОСВЕД — ДЗЕЛІЦЦА З ІНШЫМІ

Ангеліна Новікава — адна з пераможцаў творчага конкурсу мінулых гадоў «Я — малады. І мне не ўсё роўна!», які ладзіўся «Чырвонкай. Чырвонай зменай». Па яго выніках дзяўчына атрымала рэкамендацыю для паступлення на журфак, але выбрала Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, чацвёрты год навучаецца ў ім па спецыяльнасці «сацыяльна-культурная дзейнасць». Але супрацоўніцтва з маладзёжным дадаткам увесь гэты час не спыняла, больш за тое, летась была прынята ў штат «Звязды». А сёлета няўрымслівая Ангеліна яшчэ пачала весці гурток «Азы журналістыкі» ў сталічным Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маяк». Як той казаў, перадае далей атрыманы вопыт працы ў СМІ. У дзвюх групах у яе — 24 школьнікі розных узростаў. Намаганні дзяўчыны ўжо прынеслі свой плён: яе «навабранцы» прапанавалі маладзёжнаму дадатку ўласныя «пробы пяра». Гэта іх першы выхад на старонкі рэспубліканскай прэсы. Магчыма, некаму падасца, што яны абралі, як лічаць некаторыя вопытныя журналісты, адносна лёгкі жанр — інтэрв'ю. Але не трэба забывацца, што аўтары — школьнікі і гэта іх першы досвед. Спадзяёмся, што выхаванцы Ангеліны на гэтым не спыняцца. Сёння мы прадстаўляем першую творчую работу.

Пэндзлікам па скуры

«Татуіроўкі» фарбай,

або Што такое мехендзі

У сучасным свеце амаль кожны падлетак марыць аб татуіроўцы, каб вылучыцца і сама-выявіцца, але з-за свайго ўзросту не можа яе зрабіць. У такіх сітуацыях на дапамогу прыходзіць мастацтва мехендзі. Многія лічаць, яго навінкай у індустрыі прыгажосці, але гэта не так. Роспіс цела спецыяльнай фарбай з'явіўся яшчэ ў старажытныя часы ў Індыі. Мы пагаварылі з майстрам у гэтай справе Марыяй БАРОДЗІЧ і высветлілі ўсе падрабязнасці такога занятку.

— Дзе зараз мехендзі карыстаецца попытам?

— На сённяшні момант найбольш шырока гэтае мастацтва распаўсюджана ў арабскім свеце, краінах Паўночнай Афрыкі і ў Індыі. Але не так даўно яно набыло папулярнасць і ў Еўропе. У асноўным малююць узоры або арнаменты, якія прымяркоўваюць да свят, вясельляў. Варта ўлічваць, што ў розных краінах ёсць свае асаблівасці пры нанясенні малюнка.

— А якія матэрыялы выкарыстоўваюцца?

— Галоўным з'яўляецца хна — фарба з высушанага лісця лаўсоніі некалючай. Яе некалькі відаў: натуральная, хна з дабаўленнем фарбавальнікаў і іншыя. Гледзячы на эскіз кожнага малюнка, майстар сам выбірае, з якой яму будзе зручней і да месца працаваць. Набыць матэрыял для мехендзі не праблема, нават у нас у Мінску можна купіць якасную хну. Таксама я часта замаўляю фарбу з Расіі ці наўпрост з Індыі.

— Як вы навучаліся гэтаму майстэрству?

— Раней я наогул не ведала пра яго, проста хацела зрабіць сабе тату, таму вырашыла паспрабаваць пахадзіць спачатку з часовым малюнкам. Знайшла ў сацыяльных сетках дзяўчыну, якая малюе хной, прыйшла да яе, зрабіла эскіз на целе, і мне спадабалася. Потым наведала мерапрыемства, дзе былі запрошаны мастакі, якія працуюць з хной, пагутарыла з імі, і мяне вельмі зацікавіла іх работа. Праз нейкі час я рашылася і пайшла на курсы. Цяпер ні кроплі не шкадую аб сваім учынку, займаюся любімай справай і нават адкрыла ўласныя курсы па мастацтве мехендзі ў двух фарматах — анлайн і ўжывую, дзе дапамагаю ўсім ахвотным асвоіць сакрэты майстэрства.

— Хто часцей за ўсё звяртаецца?

— Ёсць людзі, якія цікавяцца Індыяй ці арабскімі краінамі, яны часта робяць малюнкі хной, каб паглыбіцца ў культуру гэтых народаў. Але часцей за ўсё гэта кліенты, якія хочуць зрабіць татуіроўку, але сумняваюцца, ці ў сілу свайго ўзросту занадта малыя для сапраўднай. Ну і, вядома ж, робяць малюнкі хной для розных тэматычных фотасесій, але гэта даволі рэдка.

— А ці не шкодная такая размалёўка на целе для дзяцей?

— Рабіць часовыя «татуіроўкі» можна, але гадоў з трох, не раней, таму што малыя не заўсёды ўседлівыя і будзе складана нанесці на іх скуру прыгожы і роўны арнамент. Акрамя гэтага варта ўлічваць такі момант, як індывідуальная непераноснасць — алергію на хну. Гэта датычыцца як дзяцей, так і дарослых. У інтэрнэце можна ўбачыць шмат розных фота з апёкамі ад фарбы, але ў сваёй рабоце, на шчасце, з такімі наступствамі не сутыкалася.

— Адкуль чэрпаеце ідэі для эскізаў?

— Звычайна кліенты самі прыносяць тое, што яны хочуць, гэта вельмі зручна і не адымае часу падчас работы. Тым больш мне трэба загадзя ведаць, колькі прыкладна спатрэбіцца часу на чалавека, каб арыентаваць астатніх кліентаў. Калі чалавек зусім не ведае, чаго хоча, то я заўсёды дапамагу яму вызначыцца, і мы разам выберам аптымальны для яго варыянт з мноства прыкладаў.

— Як доўга трымаецца малюнак хной?

— Гэта ўсё вельмі індывідуальна, часцей за ўсё залежыць ад часткі цела, на якой ён размешчаны. Напрыклад, на кісці рукі «тату» трымаецца пяць — сем дзён, бо мы ж ёй усё робім, да таго ж мыем, асабліва часта цяпер у мэтах бяспекі. На нагах малюнак захаваецца даўжэй, чым на іншых месцах, прыкладна на два тыдні. Час на выкананне самога малюнка таксама індывідуальны. Усё залежыць ад складанасці эскіза, аб'ёму і наяўнасці ценяў на ім. І, вядома, пры рабоце з кліентамі я заўсёды адводжу час на прасушку «татуіроўкі» фарбай, для гэтага павінна прайсці мінімум хвілін пятнаццаць — дваццаць.

— З якімі цяжкасцямі сутыкаецеся?

— Самае складанае ў маёй прафесіі, гэта абвяргаць міфы, напрыклад, пра небяспеку хны. Ну і, вядома, фізічны складнік, мая работа сядзячая, таму ёсць нагрузка на спіну. Калі няправільна маляваць, то, адпаведна, будуць балець пальцы і рукі. Але ўсе гэтыя дробныя праблемы не параўнаюцца з плюсамі майго занятку. Галоўнае — ты бачыш удзячнасць за сваю работу ад кліентаў, бачыш, як робіш іх больш шчаслівымі і на крок бліжэйшымі да мары.

Кацярына АНДРЭЙЧЫК,
вучаніца 7 класа СШ № 36 г. Мінска.
Фота дадзена гераіняй.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 21 декабря 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/С-62752 общей площадью 511,5 кв. м (наименование: здание склада песка; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000005003385 площадью 1,9410 га (право постоянного пользования)
Местонахождение: г. Минск, ул. Железнодорожная, 35/5
Начальная цена: 2 167 743,06 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 216 774,00 бел. руб.
Шаг аукциона: 216 774,00 бел. руб.

Продавец имущества: ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН», ул. Железнодорожная, д. 35, 220089, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона и заключается после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **21 декабря 2020 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.12.2020 по 17.12.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (029) 615-11-11.

Ранее извещения о проведении торгов были опубликованы в газете «Звязда» 19.08.2020 и 29.10.2020.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(029) 615-11-11 (ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»).

ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ЗАО «Ростэм»

Лот	Наименование	Местонахождение	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона без НДС, бел. руб.
1	Доля в уставном фонде Общества с ограниченной ответственностью «Агрофирма Илья» в размере 100 %	Минская область, Вилейский р-н, д. Ободовцы	3 008 000,00	300 800,00	150 400,00

В отношении Лота проводятся пятые повторные торги. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 145 (29259) от 29.07.2020, стр. 14; № 175 от 09.09.2020, стр. 11, № 181 от 17.09.2020, стр. 15, № 193 от 03.10.2020 стр. 6, № 207 от 23.10.2020, стр. 6, № 225 от 18.11.2020 стр. 14

УСЛОВИЯ АУКЦИОНА И КРИТЕРИИ ВЫЯВЛЕНИЯ ПОБЕДИТЕЛЯ

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Аукцион проводится до наиболее высокой цены предмета аукциона. Аукционист объявляет участника, предложившего более высокую цену за предмет аукциона, трижды повторяет последнюю цену и при отсутствии надбавок объявляет о том, что имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Данный участник получает статус «Претендент на покупку» и на него распространяются правила и условия, установленные законодательством для победителя аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

Вознаграждение аукциониста – 1 % от конечной цены предмета торгов, складывающейся в ходе торгов.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Начало приема заявлений в 10.00 10.12.2020 г. Окончание приема заявлений в 16.00 23.12.2020 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Аукцион состоится 24.12.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by.

До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Ростэм» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.».

Срок внесения задатка: с 10.00 10.12.2020 г. по 16.00 23.12.2020 г.

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра **+375 (44) 759-42-67, Михаловский Эдуард Михайлович**.

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону **+375 29 308 28 97 (Анаида).**

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

— А валанцёрства даступнае для пажылых людзей?

— Так, і мы стараемся развіваць гэтую форму работы. У Рэспубліканскім цэнтры геранталогіі ёсць праект «Банк вольнага часу». Людзі самага рознага ўзросту, у тым ліку пажылыя, могуць прыйсці да аўдыторыі і прачытаць лекцыю па сваёй дысцыпліне або навучыць прысутных бабуль і дзядуляў якому-небудзь навыку. Мы стараемся развіваць рух «Срэбнае валанцёрства»: як правіла, людзі сталага ўзросту лепш за ўсіх ведаюць праблемы сваіх аднагодкаў у тым ці іншым рэгіёне — удзельнікі руху шукаюць шляхі іх вырашэння. У цэлым частка пажылога насельніцтва краіны вельмі актыўная і сучасная. Але ёсць і пасіўная частка нашых пенсіянераў. На яе ў найбліжэйшай будучыні мы плануем зрабіць акцэнт. Вельмі важна вярнуць цікавасць да жыцця менавіта ім. Бо радасць і жаданне жыць — тое, што адсоўвае чалавека ад дэменцыі.

НЕЗАМЕННЫЯ СТАРЫЯ

Людзі пенсійнага ўзросту — бясцэнны рэсурс для дапамогі маладым, кажа Людміла Жылевіч. Пры гэтым адна з прычын дэменцыі — пачуццё незапатрабаванасці.

— Успомніце: яшчэ гадоў 30 таму сям'я трымалася на бабулі і дзядулю. Яны гадавалі ўнукаў, пакуль іх дзеці былі на рабоце. Так, сёння родныя ўнукі часам жывуць за многія сотні кіламетраў ад сваіх бабуль і дзядуляў. Але ж у вашым пад'ездзе або ў вашай вёсцы ёсць і іншыя дзеці. Ёсць і мамы, якія літаральна разрываюцца паміж домам і работай. Бабуля, якая робіць урокі з вучнямі малодшых класаў або забірае з садка малых, каб мама не неслася з работы праз увесь горад — такая бабуля будзе нарасхват! Гэта можа быць валанцёрства ці падпрацоўка: прыбаўка да пенсіі. Да таго ж, у жыццё пажылога чалавека дадаецца незаменны кампанент — навучанне: успамінаючы школьную праграму, ён аднаўляе функцыі мозга. Ёсць прымяненне і дзядулям. Звярніце ўвагу: сёння хлопчыкі растуць практычна без мужчын. Настаўнікі ў школе, выхавальнікі ў дзіцячым садзе — на 95 працэнтаў гэта жаночыя калектывы. Таты або ў разводзе з мамамі, або ўвесь час працуюць. А дзядулі маглі б навучыць хлопчыкаў у сваім двары, як забіць цвік, як працаваць з інструментамі і мноству іншых неабходных мужчыне навыкаў. І гэта быў бы ўзаемавыгадны абмен.

Тым больш, адзначае спецыяліст, калі пажылы чалавек знаходзіцца ў соцыуме, ён перастае быць лёгкай здабычай для ашуканцаў — побач будуць тыя, хто зможа яго аберагчы.

— Ну, а самая галоўная прафілактыка развіцця старэчай дэменцыі — гэта падзяка. Тэлефануйце бацькам, бабулям і дзядулям часцей, наведвайце іх пры любой магчымасці. І кожны раз кажыце ім «дзякуй» — за любую дробязь і нават без прычыны. Ад гэтага «дзякуй» у жыцці пажылога чалавека ўсё мяняецца. Ён адчувае сябе патрэбным, і гэта пачуццё не дае хваробе ніводнага шанцу.

Дзіяна РОНІНА.

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ФИНАНСОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ОАО «Банк БелВЭБ» на 30 сентября 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	30.09.2020 (неаудировано)	31.12.2019
Активы		
Денежные средства и их эквиваленты	1 069 836	809 633
Драгоценные металлы	5	158
Средства в кредитных организациях	52 152	65 423
Производные финансовые активы	3 649	73
Кредиты клиентам	3 644 211	3 410 592
Инвестиционные ценные бумаги:		
- переоцениваемые по справедливой стоимости через прочий совокупный доход	614 396	415 390
Торговые ценные бумаги и иные активы, переоцениваемые по справедливой стоимости через прибыль или убыток	239	-
Инвестиции в ассоциированные и совместно контролируемые компании	5 345	5 257
Основные средства	50 399	51 761
Активы в форме права пользования	8 147	4 559
Нематериальные активы	38 967	41 620
Текущие активы по налогу на прибыль	423	654
Отложенные активы по налогу на прибыль	-	-
Прочие активы	34 176	30 852
Итого активы	**5 521 945**	**4 835 972**
Обязательства		
Средства кредитных организаций	1 399 508	1 293 375
Задолженность перед Национальным банком Республики Беларусь	100 026	21
Производные финансовые обязательства	3 240	1 258
Средства клиентов	2 648 172	2 541 000
Выпущенные долговые ценные бумаги	93 519	46 767
Обязательства по договорам аренды	9 324	4 195
Текущие обязательства по налогу на прибыль	68	3 643
Отложенные обязательства по налогу на прибыль	32 992	18 304
Прочие обязательства и резервы	282 947	55 918
Субординированные займы	266 481	212 600
Итого обязательства	**4 836 277**	**4 177 081**
Капитал		
Уставный капитал	473 057	473 057
Эмиссионный доход	458	458
Дополнительный капитал	5 485	5 485
Фонд переоценки зданий	2 485	2 502
Фонд переоценки ценных бумаг	(15 104)	15 617
Нераспределенная прибыль	219 287	161 772
Итого капитал, приходящийся на акционеров Банка	**685 668**	**658 891**
Неконтрольные доли участия	-	-
Итого капитал	**685 668**	**658 891**
Итого капитал и обязательства	**5 521 945**	**4 835 972**

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ ИЛИ УБЫТКЕ ОАО «Банк БелВЭБ» за период, закончившийся 30 сентября 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

	За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2020 (неаудировано)	За 9 месяцев, закончившихся 30.09.2019 (неаудировано)
Процентная выручка, рассчитанная с использованием эффективной процентной ставки		
Кредиты клиентам	212 654	199 694
Инвестиционные ценные бумаги	26 208	37 579
Средства в кредитных организациях	3 199	1 813
	242 061	**239 086**
Процентные расходы		
Средства кредитных организаций	(34 867)	(32 610)
Средства клиентов	(56 203)	(49 202)
Субординированный кредит	(11 568)	(12 696)
Договоры аренды	(375)	(107)
Выпущенные долговые ценные бумаги	(1 457)	(3 615)
	(104 470)	**(98 230)**
Чистый процентный доход	**137 591**	**140 856**
Создание резервов по кредитным убыткам	(23 869)	(2 353)
Убыток от модификации кредитов	(4 313)	(5 109)
Чистый процентный доход после создания резерва по кредитным убыткам	**109 409**	**133 394**
Эффект первоначального признания финансовых инструментов, по которым начисляются проценты	7 116	1 333
Чистые комиссионные доходы	56 628	50 704
Доходы, за вычетом расходов по операциям с финансовыми инструментами, переоцениваемыми по справедливой стоимости через прибыль или убыток		
- в т. ч. по кредитам клиентам, оцениваемым по справедливой стоимости через прибыль или убыток	3 299	-
Чистые доходы/(расходы) по операциям с инвестиционными финансовыми активами, переоцениваемыми по справедливой стоимости через прочий совокупный доход	476	-
Чистые доходы/расходы по операциям в иностранной валюте:		
- торговые операции	23 272	18 845
- операции с валютными производными финансовыми инструментами	(16 202)	4 021
- переоценка валютных статей	(19 579)	(5 699)
Доля в прибыли /(убытке) ассоциированных и совместно контролируемых компаний	88	(533)
Прочие доходы	41 783	50 726
Непроцентные доходы	**96 881**	**119 397**
Расходы на персонал	(44 802)	(51 704)
Амортизация	(17 734)	(18 049)
Налоги кроме налога на прибыль	(3 264)	(2 290)
Прочие операционные расходы	(66 771)	(52 356)
Прочие (расходы)/доходы от обесценения и создания резервов	(2 524)	943
Непроцентные расходы	**(135 095)**	**(123 456)**
Прибыль до расхода по налогу на прибыль	**71 195**	**129 335**
Расход по налогу на прибыль	(13 696)	(19 831)
Прибыль за отчетный период	**57 499**	**109 504**
Приходящиеся на:		
акционеров Банка	57 499	109 504
неконтролирующую долю участия	-	-

Председатель Правления банка В.С.Матюшевский

Главный бухгалтер О.С.Турбина

20 ноября 2020 г.

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность по МСФО за 2020 год».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 21.12.2018 № 6. УНП 100010078.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Рогознянский»

Предмет торгов – Лот: капитальное строение с инвентарным номером 101/С-8305 (наименование: двухэтажное кирпичное производственное здание; назначение: здание специализированное иного назначения) площадью 1048,3 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, 87/1, на земельном участке с кадастровым номером 122581505102000005, площадью 1,9399 га.
Составные части и принадлежности: уборная, сарай, котельная

Начальная цена, руб.	1 базовая величина	Размер задатка, руб.	1 базовая величина

Продавец: ОАО «Рогознянский», 225111, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Ленинский, ул. Ленина, 14, тел./факс 80164165133.
Организатор торгов: Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
Реквизиты для перечисления задатка: р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245.
Срок заключения договора купли-продажи: в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты: в соответствии с заключенным договором купли-продажи.
Информация о возмещении затрат: участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукциона (в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона).
Обременения: наличие действующих договоров аренды.
Обязательные условия продажи объекта за одну базовую величину:
1) Осуществление предпринимательской деятельности, в том числе ремесленной деятельности либо деятельности, при осуществлении которой физические лица, не осуществляющие предпринимательскую деятельность, уплачивают единый налог, с использованием приобретенного имущества (объекта) и (или) построенного нового после его снова в течение трех лет, начиная:
- не позднее одного года с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта;
- в случае использования права сноса приобретенного объекта и строительства нового объекта либо сноса отдельных объектов, входящих в состав приобретенного недвижимого имущества, которые не могут быть использованы, – не позднее трех лет с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта. В целях использования данного права не позднее двух месяцев с даты подписания акта приема-передачи приобретенного объекта обратиться с заявлением в Жабинковский районный исполнительный комитет для получения разрешительной документации на снос объекта, а также на проектирование и строительство в порядке и в сроки, определенные разрешительной (проектной) документацией.
2) Запрещение отчуждения, передачи без перехода права собственности, залога приобретенного имущества (построенного нового, реконструированного), расположенного по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Ленинский с/с, д. Чижевщина, ул. Центральная, д. 87/1 до выполнения покупателем условий договора купли-продажи, за исключением случаев его отчуждения, передачи без перехода права собственности юридическому лицу, собственником имущества, учредителем (участником) которого является покупатель, и принявшему на себя все обязательства и ответственность путем заключениям дополнительного соглашения о внесении соответствующих изменений в договор купли-продажи

Аукцион состоится 12 января 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://ocenakabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02, 8 (029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 11 января 2021 г. до 17.00

Ранее извещение о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Рогознянский» опубликовано в газете «Звязда» от 03.04.2020

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37**

Предмет аукциона

Лот № 1
Месторасположение:
Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 91А и 91Д

Производственная база в составе: **склад РМХ-20** (350/С-174808, 193,5 кв. м), **здание материального склада № 2** (350/С-56797, 478,6 кв. м), **здание административно-бытовое** (350/С-56799, 550,5 кв. м), **гараж** (350/С-56788, 675 кв. м), **склад по обогреву инертных материалов** (350/С-56798, 29.6 кв. м), **склад масел** (350/С-56822, 23,5кв. м), **здание материального склада № 1** (350/С-56796, 1072,5 кв. м), **склад цемента** (350/С-56819, 33 кв. м), **проходная** (350/С-56823, 14,8 кв. м), **компрессорная** (350/С-56820, 62,6 кв. м), **котельная** (350/С-56800, 110 кв. м), **ограждение и бетон. площадка производ. базы** (350/С-204615, составные части: ограждения – ж/б – 468,1, 316,0 и 1214,5 кв. м, из металлической сетки – 11,5 кв. м, деревянное – 17,1 кв. м, металлическое – 4,8 кв. м, кирпичное – 4,3 кв. м; ворота, калитка, площадка бетон., покрытия).
Сведения о земельном участке: предоставлены на праве постоянного пользования пл. **4,4874** га для эксплуатации и обслуживания администрат. и производственно-склад. помещений производ. базы и пл. **0,5576** га для эксплуатации и обслуживания зданий специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ.
Обременения прав на зем. уч. 0,5576 га – охранные зоны линий связи и радиофикации, электрич. сетей, сетей и сооружений водоснабжения и канализации

Обременения: площади здания матер. склада № 2, бетон. площадка, склад масел, часть помещений гаража и здания матер. склада № 1 сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 50 822,38 бел. руб.
(снижена на 78 %)

Лот № 2
Месторасположение:
г. Минск, пер. Софьи Ковалевской, д. 46, 46/1-46/3, 46/5, 46/6

Производственная база в составе: **склады** (1193,9 кв. м, 500/С-28335), **здание АБК** (137,2 кв. м, 500/С-28334), **здание многофункциональное** (4270,2 кв. м, 500/С-28468, составные части: дворовая территория, тротуар, подпорная стенка, бордюр, ограждение, эстакада, отстойник, заборы, ворота, площадки для складирования, подъездного пути грузового крана и для размещения сушильного оборудования), **производ. цех** (1 411,0 кв. м, 500/С-28339), **здание специализир. для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель** (357,3 кв. м, 500/С-51092), **здание котельной** (65,1 кв. м, 500/С-51093, составные части: труба дымовая), **ливневая канализац. сеть (внеплощад.)** (103,96 п. м, 500/С-1008470), **ливневая канализац. сеть (внутриплощад.) с очистным сооружением** (271,39 п. м, 500/С-1008471), **внеплощад. водопров. сеть** (158,99 п. м, 500/С-1008467), **внутриплощад. водопровод. сеть** (351,44 п. м, 500/С-1008461), **хозяйственно-фек. канализац. внутриплощад. сеть** (321,36 п. м, 500/С-1008477), **тепловая сеть, сеть горячего водоснабжения** (88,3 и 87,7 п. м, 500/С-1008462). **Иное имущество,** входящее в состав лота: сети 0,4 КВ (инв. № 83), блоки гаражные 6,2*3,2 (3 шт. – инв. № 7, 70317, 70318), аспирац. установки (2 шт. – инв. № 238, 239, 80), шлагбаум (инв. № 1147), котлы водогрейные «Минск-1М» (2 шт. – инв. № 793, 794), теплосчетчик ТЭМ-104-1 ДУ 100 (инв. № 795), теплообменник пластичный (инв. № 796), насосы ТР-300/2 (2 шт. – инв. № 797, 798), насос ТРЕ 40-190/2 (инв. № 799), краны подвесные электри. однобал. (6 шт. – инв. № 94, 102, 41185, ГП2Т. – инв. № 101, 109, ГП1Т – инв. № 110); многолетние насаждения (инв. № 760 – 786, 7870, 7881)

Сведения о земельных участках:
- пл. **2,4498** га, предоставлен на праве общего долевого постоянного пользования (доля: 9569/10000) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений производ. базы ПМК-1. Ограничения (обременения) прав: водоохран. зоны водных объектов г. Минска, пл. 0,9124 га и 0,4420 га;
- пл. **0,4528** га, предоставлен на праве временного долевого пользования (доля 1/2, срок действия по 31.01.2030) для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений (проезд).
Ограничения (обременения) прав: водоохран. зоны водных объектов, охран. зоны сетей и сооружений водоснабжения и канализации

Дополнительная информация: в состав лота не входит оборудование трансформат. подстанции ТП-2267 (ТМ 250/10), камеры силового оборудования РП-2267, хозфек. канализац. внеплощад. сеть (инв. № 500/С-1008466)

Обременения: площади частично сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 955 144,51 бел. руб.
(снижена на 25 %)

Задаток (лот № 1 – 10 %, лот № 2 – 1 %) от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.11.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 12.01.2021 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.01.2021 до 17.00** по указанному адресу

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@cpo.by

О созыве собрания акционеров ОАО «Гуртпромстрой».
Повестка дня:
1. О продлении срока ликвидации ОАО «Гуртпромстрой».
2. Об утверждении порядка реализации имущества.
Собрание состоится **6 января 2021 года в 12.00** по адресу: **223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. М. Богдановича, д. 230А.**
Телефон для справок А1 8-044-72-35-122.
УНП 600154463

О созыве собрания акционеров ОАО «Слуцк-Модуль».
Повестка дня:
1. О продлении срока ликвидации ОАО «Слуцк-Модуль».
2. Об утверждении порядка реализации имущества.
Собрание состоится **6 января 2021 года в 10.00** по адресу: **223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. 14 Партизан, д. 101.**
Телефон для справок А1 8-044-72-35-122.
УНП 600074992

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-53647 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина № 4), обшей площадью 110,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Новогрудок, ул. Свердлова, 27А. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 424350100001000382 площадью 0,0712 га (назначение – обслуживания магазина № 4), расположенном по адресу: г. Новогрудок, ул. Свердлова, 27А. Начальная цена продажи лота – 71 311,20 руб. (семьдесят одна тысяча триста одиннадцать рублей двадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 7 131 руб. (семь тысяч сто тридцать один рубль)
Продавец – ОАО «Большая Крыница», 231400, г. Новогрудок, ул. Волчецкого, 36а, тел. 8-01597-256-92
Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70
Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона
Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Аукцион состоится 12 января 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3
Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18
Последний день приема заявлений – 06 января 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 21 декабря 2020 года повторных торгов по продаже имущества, принадлежащего ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/С-62751 общей площадью 346 кв. м (наименование: здание склада щебня; назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ)
Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000005003385 площадью 1,9410 га (право постоянного пользования)
Местонахождение: г. Минск, ул. Железнодорожная, 35/4
Начальная цена: 2 075 841,27 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 207 584,00 бел. руб.
Шаг аукциона: 207 584,00 бел. руб.

Продавец имущества: ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН», ул. Железнодорожная, д. 35, 220089, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, а также возмещает затраты на организацию и проведение торгов в течение 5 дней со дня проведения торгов на расчетный счет организатора торгов.

Торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона и заключается после предъявления копий документов, подтверждающих возмещение затрат на организацию и проведение аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **21 декабря 2020 года в 10.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.12.2020 по 17.12.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (029) 615-11-11.

Ранее извещения о проведении торгов были опубликованы в газете «Звязда» 19.08.2020 и 28.10.2020.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(029) 615-11-11 (ИООО «ЦЕНТРОБЕТОН»).

КРЫЗІС «ПАД ЁЛКУ»

Чаму Украіна апынулася на мяжы дэфолту?

Цяпер у краіне агульная сума непрафінансаваных расходаў дасягае 195 мільярдаў грыўняў (каля 7 млрд доларaў) толькі па агульным фондзе дзяржаўнага бюджэту. Такі прагноз апублікаваў Цэнтр аналізу публічных фінансаў і публічнага ўпраўлення Кіеўскай школы эканомікі. Раней міністр фінансаў краіны Сяргей Марчанка заяўляў, што з-за сур'ёзнага недавыканання плана ўтворыцца сур'ёзны фіскальны разрыў. Па песімістычным сцэнарыі (пры ўмове адсутнасці пазітыўных сігналаў ад МВФ і падтрымкі іншых міжнародных партнёраў), ва ўкраінскага ўрада не будзе сродкаў на пакрыццё да 114 мільярдаў грыўняў выдаткаў (каля 4 млрд доларaў). «Пазычаць ужо няма дзе, і мы цесна ўвайшлі ў бюджэтны крызіс, — такім меркаваннем у эфіры ўкраінскага тэлеканала падзяліўся эканамічны эксперт Юрый Атаманюк. — У бюджэце ў нас сёння найгоршая сітуацыя за апошнія дзесяць гадоў». Чаму Украіна апынулася на мяжы дэфолту?

БЛІЗКА ДА ПРОРВЫ

Экс-прэзідэнт Грузіі, колішні губернатар Адэскай вобласці, а цяпер кіраўнік Выканаўчага камітэта рэформаў Украіны Міхаіл Саакашвілі заявіў, што эканоміку краіны ў найбліжэйшы час чакаюць непазбежныя катаклізмы. «Украінская эканоміка цяпер рушыць да вялікай катастрофы. Ва Украіне насоўваецца вельмі моцны бюджэтны крызіс», — адзначыў палітык у эфіры тэлеканала «Украіна-24».

Паводле яго слоў, ужо з 2021 года ва Украіны будуць праблемы з выплатамі заробкаў і пенсій. «Такога не было з 1990-х гадоў. Таму, калі такая сітуацыя, ці трэба тэрмінова нешта рабіць, ці проста краіна вылятае ў трубу. Проста з закрытымі вачыма рушым у прорву. І гэта адбываецца ва ўмовах, калі ўрад практычна не функцыянуе, як быццам ён існуе ў паралельным свеце», — лічыць Міхаіл Саакашвілі.

У чэрвені палітык ужо заяўляў, што Украіна знаходзіцца на мяжы эканамічнай катастрофы. Тады ў інтэрв'ю Дзмітрыю Гардону Саакашвілі сказаў, што да такой высновы прыйшоў, азнаёміўшыся з чарговым дакладам Міжнароднага валютнага фонду. «Не трэба рабіць выгляд, што нам нічога не пагражае. Пагражае. А некаторай колькасці ўкраінскіх сем'яў пагражае голад», — сказаў ён.

У ліпені нямецкая газета Handelsblatt паведаміла пра пагрозу банкруцтва Украіны на фоне абавязацельстваў Кіева ў тэрміновым парадку забяспечыць пагашэнне вялікай запазычанасці перад замежнымі крэдыторамі. «Толькі ў гэтым годзе Украіне трэба будзе рэфінансаваць старыя крэдыты ў аб'ёме 17 млрд доларaў, тэрмін пагашэння якіх ужо праходзіць», — адзначыла выданне.

ДАЎГІ РАСТУЦЬ...

Разам з трывожнымі бюджэтнымі справаздачамі эканамічная статыстыка падкрэслівае значныя праблемы. Сёлета па выніках трох кварталаў дзяржаўны доўг Украіны ўзрос на 347 мільярдаў грыўняў (12,3 млрд доларaў) — да 2,3 трыльёна грыўняў. Асноўная прычына — дэвальвацыя нацыянальнай валюты. Пра гэта паведаміла Падліковая палата Украіны.

Па словах старшыні ведамства Валерыя Пацкана, затраты на выкананне даўгавых абавязацельстваў у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года павялічыліся да 433 мільярдаў грыўняў і склалі 36 працэнтаў праведзеных у студзені—верасні 2020 года расходаў дзяржаўнага бюджэту. Гэта зменшыла фінансавыя магчымасці для рэалізацыі іншых праграм. Спецыяліст адзначыў, што толькі на абслугоўванне дзярждоўгу было накіравана 13 % даходаў дзяржаўнага бюджэту.

«Нізкая якасць макраэканамічнага прагнозу прывяла да недапаступлення 76 мільярдаў грыўняў даходаў дзяржаўнага бюджэту і адначасова змяншэння расходаў на пагашэнне і абслугоўванне доўгу і некаторых выдаткаў на 30 мільярдаў грыўняў», — адзначылі ў Падліковай палаце Украіны.

...А ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ЗГОРТВАЕЦЦА

Аб'ём прамысловай вытворчасці ва Украіне ў кастрычніку адносна адпаведнага перыяду летась скараціўся на 5 %. Гэта больш, чым у сёлетнім верасні, калі было зафіксавана падзенне на 4,4 %. Пра гэта сведчаць даныя Дзяржаўнай службы статыстыкі Украіны.

Паводле даных статыстычнага ведамства, за студзень—кастрычнік 2020-га ў параўнанні са студзенем—кастрычнікам мінулага года прамысловая вытворчасць скарацілася на 6,8 %. Падзенне ў здабыўной прамысловасці і распрацоўцы кар'ераў склала 4,4 %, у перапрацоўчай прамысловасці — 8,3 %, у пастаўках электраэнергіі, газу, пары і кандыцыянаванага паветра — 4,5 %.

Рэзкае падзенне прамысловай вытворчасці ва Украіне пачалося восенню мінулага года. Сёлета ў студзені аб'ёмы прамысловай вытворчасці скараціліся на 5,1 %, а ў лютым падзенне запаволілася да 1,5 %, аднак у сакавіку паскорылася да 7,7 %. У красавіку падзенне склала 16,2 %, у маі — 12,2 %, у чэрвені — 5,6 %, у ліпені — 4,2 %, у жніўні — 5,3 %, у верасні — 4,4 %.

РАЗВІТАННЕ З НАДЗЕЯМІ

Пры гэтым спадзяванні на знешнія крыніцы фінансавання растаюць літаральна на вачах. Адмова МВФ выдзеліць Украіне надзвычайнае фінансаванне, нягледзячы на выкананне ўсіх умоў праграмы супрацоўніцтва, можна разглядаць як яшчэ адзін крок краіны да даўно чаканага дэфолту, адзначае eadaily.com. Каранавірусны крызіс падарваў усе разлікі ўкраінскіх улад на аднаўленне эканамічнага росту за кошт прыцягнення знешніх інвестыцый — цікавасць еўрапейскага бізнесу да Украіны за апошні год рэзка ўпала. Прычым фактар пандэміі тут зусім не самы галоўны, давер да перспектыў краіны па-ранейшаму падрывае высокі ўзровень карупцыі і адсутнасць рэальнага прагрэсу ў абвешчаных уладамі рэформах. Незалежныя даследаванні дэманструюць, што расчараванне ўкраінскага і замежнага бізнесу леташнім прыходам да ўлады Уладзіміра Зяленскага нарастае на вачах.

«За апошнія 12 месяцаў наша ўяўленне пра перспектывы Украіны паслядоўна пагаршалася», — канстатавалі эксперты IIF (міжнародная асацыяцыя найбуйнейшых банкаў і фінансавых інстытутаў) у сваім бюлетэні, які выйшаў ужо пасля таго, як Украіна атрымала адмову ад МВФ. Да падобных высноў прыйшлі эксперты ўкраінскай інвестыцыйнай кампаніі Dragon Capital па выніках апытання замежных інвестараў, праведзенага разам з Еўрапейскай бізнес-асацыяцыяй і кіеўскім Цэнтрам эканамічнай стратэгіі. Амаль палова рэспандэнтаў заявіла, што інвестыцыйная прывабнасць Украіны зніжаецца, і толькі дзевяць працэнтаў апытаных убачылі ў гэтай сувязі паляпшэнне (астатнія павекамілі, што не назіраюць істотных змяненняў).

Упершыню за пяць гадоў правядзення падобных апытанняў галоўнай перашкодай для замежных інвестыцый ва ўкраінскую эканоміку быў названы недавер да судовай сістэмы, на другім месцы апынулася шырокае распаўсюджанне карупцыі, на трэцім — манапалізацыя рынкаў і захоп улады алігархамі. Самай значнай рызыкай для інвестыцыйнага клімату Украіны прадстаўнікі замежнага бізнесу назвалі дэфолт па дзяржаўных запазычанасцях.

Меркаванне замежных інвестараў падзяляе і ўкраінскі бізнес, пракаментавала вынікі апытання выканаўчы дырэктар Еўрапейскай бізнес-асацыяцыі Ганна Дзеравянка. «У мінулым годзе мы спадзяваліся на хуткія рынкавыя рэформы, турэмныя тэрміны для карупцыянераў і неразагрузку інстытутаў улады з удзелам прафесіяналаў з моцнымі маральнымі перакананнямі. За апошнія паўгода гэтыя надзеі змяніліся расчараваннем ад незразумелай кадравай палітыкі, якая рэалізуецца на карысць алігархаў і карупцыянераў», — дадаў генеральны дырэктар Dragon Capital Томаш Фіяла.

Вельмі красамоўна ў гэтай патавай сітуацыі прагучала інфармацыя наконт таго, што Злучаныя Штаты ў рамках праграмы замежных ваенных паставак прадалі Украіне ў 2020-м фінансавым годзе ўзбраення на суму 510 млн доларaў — рэкордны паказчык за ўвесь час. Пра гэта гавораць звесткі, змешчаныя ў дакладзе Агенцтва па абаронным супрацоўніцтве і бяспецы ЗША. Паводле яго інфармацыі, адпаведны паказчык для Украіны ў мінулым годзе склаў 272,4 млн доларaў.

Пётр ДУНЬКО.

❍ **ДАСЛОЎНА**

Насмешка са здаровага сэнсу

Далучэнне Украіны да заходніх санкцый у дачыненні да Беларусі — чарговае несамастойнае рашэнне гэтай краіны. Пра гэта заявіў **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** па выніках пасяджэння ў Мінску калегій знешнепалітычных ведамстваў Беларусі і Расіі, паведаміла БелТА. Ён падкрэсліў, што далучэнне Украіны да заходніх санкцый у дачыненні да Беларусі — гэта чарговае несамастойнае рашэнне суседняй краіны, якое дэманструе непаслядоўнасць яе палітыкі. «Калі гаварыць адкрыта, мы разглядаем гэта як насмешку са здаровага сэнсу», — заявіў Уладзімір Макей. Па словах міністра, беларускі бок ужо выпрацаваў і гатовы прыняць меры ў адказ. «Будзем глядзець, як падзеі будуць развівацца далей. Мы не будзем пакідаць без адказу ніводнае з дзеянняў Украіны, накіраванае супраць беларускай дзяржавы», — папярэдзіў Уладзімір Макей.

Кніжны гасцінец

Як перакласці шэпт дажджу і запаволіць чытанне

Алесь Разанаў. Маланка жне, гром малоціць. Вершаказы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2020.

«Рэчка — рух, возера — спакой, рэчка — у спрэчцы, возера — у роздуме, рэчка няўрымслівая, як рысак, возера ўстойлівае, як воз, рэчка — у сустрэчах і расстаннях, возера — у сябе дома...»

Паэт Алесь Разанаў нанізвае вобразы, як пацеркі, на нітку эпасу, на прамень філасофскага сэнсу, які апынецца ў сарцавіне тэксту і з'яднае і фрагменты кожнага твору, і ўсе творы зборніка ў адно цэлае.

Шлях атаясамлівання, як і належыць: у кроплі — акіян, у побытавай рэчы — сусвет... Паэт па-ранейшаму перакладае шэпт дажджу і стварае глабальнае, універсальнае ў беларускіх каардынатах. Кніга «Маланка жне, гром малоціць» сабрала вершаказы розных часоў — гэта адна з прыдуманых Алесем Разанавым формаў, а былі яшчэ, нагадаю, версэты, квантэмы, зномы, пункціры.

«Галоўная дзеючая асоба ў вершаказах — само, зродненае з рэччу ці з'явай, слова. Яно вымаўляе сябе, выяўляе і вымалёўваецца ў карціну» — тлумачыцца ў прадмове. Дзеючыя асобы вершаказаў — дуб, каса, горад, пчала, дзверы, дым, крыга, смага, воўк, хлеб, грошы, сякера, ліхтар, кішэня... Паўтары сотні словаў, агульным для якіх з'яўляецца толькі тое, што яны змаглі даць штуршок фантазіі і мыслярству паэта, хоць Разанаў — не першы, хто спрабуе пранікнуць у абалонку слова, як фізік — у атам, каб пабачыць бездань, што жыве па сваіх законах.

Часам, каб дэструктураваць слова, максімальна дастаць з яго сэнсы, аўтар бярэ аналогіі з іншых моў.

«Лацінскае sol — квінтэсенцыя свету, соль рэчаіснасці.

Нямецкае Sonne знае сэнс (Sinn) усіх з'яў; яно ззяе, як звон, і, як звон сваю звонкасць выпраменьвае сваё ззянне, свой «зной», на ўсе зоны прасторы.

Стараславянскае слънце сланяецца ад небасхілу да небасхілу: у ім тая няспешнасць, тая ленасць, якая дазваляе ўсім істотам адчуваць сябе далучанымі да лона вечнасці...

Беларускае сонца — бясконцы сон, які абяцае, што некалі ён увасобіцца ў яву».

Да тэксту, што кідае выклік інтэлекту чытача, далучаецца адпаведнае афармленне. Мастачка Кацярына Дасько зрабіла лаканічную графіку, у якой таксама хаваюцца вобразы і сімвалы ў той колькасці, у якой іх зможа вылучыць уважлівы чытач.

І калі ў каго ёсць сумневы, што беларуская літаратура — паўнавартасная частка еўрапейскай, яму варта звярнуцца да паэзіі Алеся Разанава. А знаўца проста атрымае асалоду, апынуўшыся ўнутры выкшталцонай «гульні ў шкляныя перлы». Таму што свет не будзе ранейшы, калі заўважыць, што дзверы адгукаюцца таму, хто стукаецца, яго ж стукам, што калі чалавек спыняецца — ён камянее, а камень, у сваю чаргу, пераймае чалавечую іпастась: на ім пішуцца імя і лічбы, а ў чоўна ёсць вочы, раскіданыя па ўсёй паверхні яго цела.

Мастацтва павольнага чытання. Гісторыя, традыцыі, сучаснасць. Масква, «Канон-плюс», 2020.

Адзін з маіх любімых кніжных набыткаў за гэты год — калектыўная манаграфія, падрыхтаваная Інстытутам сусветнай літаратуры імя Горкага Расійскай акадэміі навук на тэму, якая мяне асабліва хвалюе, як кожнага «кніжнага» чалавека ў эпоху інфармацыйнага выбуху. Ці выжыве высокая літаратура ў часы, калі людзі развучыліся яе ўспрымаць, атрымліваць задавальненне ад стылю? Бо чытач — суаўтар пісьменніка, і колькі разоў кніга прачытаная — столькі варыянтаў яе існуе. Самая добрая кніга ў адсутнасці дасведчанага чытача — пляскання ў ладкі адной далонню. Метад «мастацтва павольнага чытання» быў сфармуляваны расійскім навукоўцам Міхаілам Гершэнзонам, 150-годдзю якога і прысвечаны зборнік. «Мастацтва бачыць скрозь прывабнасць формы бачанне мастака». Паўтара дзясятка артыкулаў слынных навукоўцаў аналізуюць «павольнае чытанне» ў розных аспектах. Гэта і трактоўка сакральных тэкстаў, і мастацкі пераклад, і дыялагічнае чытанне, якое разглядаецца на прыкладзе Хорхе Луіса Борхеса... Кожнага з аўтараў, падобна, тэма закранае не толькі як навукоўца — а гэта дадае неабходны эмацыянальны элемент. Колькі сёння існуе курсаў, каб навучыцца хутка чытаць, засвойваць усё большыя аб'ёмы інфармацыі! Але інфармацыя не тоесная твору, як не тоесны клубок нітак, звязанай з яго прыгожай сурвэтцы — хоць не змянілася ні фактура матэрыялу, ні яго колькасць. На думку доктара філасофскіх навук Валерыя Падарогі, у свеце хуткачытання знікае сама літаратура — яна замяняецца масмедыя. А пісьменнікі, якія маюць масмедыйны поспех, ствараюць сімулятыўную літаратуру, хоць і намагаюцца захаваць імідж «высакалобай эліты». Змянілася ўсё, нават месцы чытання. Цяпер гэта — метро, калідор паліклінікі, але не крэсла перад камінам ці стол, за якім сабраліся сямейныя, каб паслухаць раздзел новага рамана Дастаеўскага. «Пры паскарэнні чытання з досведу чалавека вымываюцца глыбінныя сэнсавыя кантэксты», — змрочна канстатуе сацыёлаг Уладзімір Нікалаеў. Так што пасля прачытання зборніка хочацца неадкладна ўзяць добры тэкст і вярнуць сабе глыбінныя сэнсы... Якім чынам — залежыць ад вас, бо навукоўцы на тое і навукоўцы, каб дыскутаваць не толькі з прафанамі, але і паміж сабой.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Даты Падзеі Людзі

10 СНЕЖНЯ

У краіне

1870 год — нарадзіўся (колішні маёнтак Багданава, цяпер Валожынскі раён) Фердынанд Рушчыц, жывапісец, графік, тэатральны мастак і педагог. Творчасць звязана з мастацкім жыццём Беларусі, Польшчы і Літвы.

1910 год — нарадзіўся (цяпер Капыльскі раён) Арсеній Аляксеевіч Нячаеў, Герой Савецкага Саюза.

1920 год — пачаліся заняткі на механічным, хімікатэхналагічным, культурна-тэхнічным, аграномічным і лясным факультэтах новаўтворанага Мінскага політэхнічнага інстытута (цяпер — Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт).

1930 год — нарадзіўся Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Арочка, беларускі паэт, літаратуразнавец, празаік, крытык, перакладчык, доктар філалагічных навук. Працаваў у Інстытуце літаратуры НАН Беларусі. Аўтар кніг паэзіі «Не ўсе лугі пакошаны...», «Падземныя замкі», «Кветкі бяссмертніка», даследаванняў па сучаснай беларускай паэзіі, літаратурных сувязях. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры».

1945 год — нарадзіўся Валерый Уладзіміравіч Кастэнка, генерал-лейтэнант. У 1968-м скончыў Мінскае вышэйшае інжынернае зенітна-ракетнае вучылішча, у 1982-м — Ваенную акадэмію Генштаба. З 1968-га на камандных пасадах у войсках ППА: камандзір батарэі, дывізіёна, палка, корпуса, намеснік камандуючага арміі ППА. З 1993-га ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь, камандуючы войскамі ППА.

У гэты ж дзень пачаў выпускаць прадукцыю адноўлены Добрушскі цэлюлозна-папяровы камбінат «Герой працы».

У свеце

1610 год — нарадзіўся Адрыян ван Остадэ, галандскі жывапісец і афартыст, майстар так званага сялянскага жанру.

1960 год — нарадзіўся Кенэт Брана, брытанскі кіна- і тэатральны акцёр, рэжысёр, сцэнарыст і прадзюсар. Пастаноўшчык і выканаўца галоўнай ролі ў экранізацыях Шэкспіра: «Генрых V», «Шмат шуму з нічога», «Гамлет». Здымаўся ў фільмах «Змова», «Гары Потэр і патаемны пакой» і іншых.

Так гаварыў...

ІАГАН ВОЛЬФГАНГ ГЁТЭ:

«Немагчыма заўжды быць героем, але заўсёды можна заставацца чалавекам».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.17	16.47	7.30
Віцебск —	9.14	16.30	7.16
Магілёў —	9.07	16.37	7.30
Гомель —	8.55	16.42	7.47
Гродна —	9.31	17.04	7.33
Брэст —	9.23	17.13	7.50

Месяц

Апошняя квадра ***8 снежня.***

Месяц у сузор'і ***Шаляў.***

Імяніны

Пр. *Аляксея, Барыса, Івана, Мікалая, Рамана, Сяргея, Якава.*

К. *Марыі, Юліі, Андрэя, Рыгора.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Куды б ні глядзеў Васіль Сямёнавіч, літаральна ўсё нагадвала яму, што ён пакінуў дома акуляры.

— Арцём, калі цябе няма, яны пра цябе такое гавораць!

— Я цябе малю! Калі мяне няма, яны могуць мяне нават біць!

— Значыць так, прыбыткам будзем дзяліць 50/50.

— Але я ж хачу 70!

— Ну добра, ты мяне ўгаварыў — 70/70!

— З аднаго боку, усё цудоўна...

— А з другога?

— А з другога — мы...

— Вы пахудзелі, колькі скінулі?

— Пяць кіло, было 150.

— Ну, гэта як з танка гайка ўпала...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3702. Нумар падпісаны ў 19.30 9 снежня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12